154 кр. "Совецкая Беларусь" Одесса, Пастерак 3, государ-ственн. публичн. библиотека. ступ. сынск. адзін экз.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучай...

Совецкая Беларусь

Орган ... Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу і інвагароднія	— 20 к.
Асобныя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасьлярох тэксту 1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьмешныя ка 50 проц. дарагоўі.
Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Бесспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх ...-тах, канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год ... ганьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА — № 272 (2761) Субота, 30-га лістапада 1929 г.

А ШЛЯХУ ДА СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

00 рабочых—на будаўніцтва калгасаў. Канчаткова ліквідуецца прышчэпаўшчына.

Калгасны рух з кожным днём расьце і пашыраецца. Бядняцка-сераднякцкія масы вёскі пад кіраўніцтвам КП(б)Б уступілі ўжо на ... суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б для правядзеньня суцэльнай ...тывізацыі вылучана ўся МАГІЛЕЎСКАЯ АКРУГА. У астатніх ...ах для суцэльнай калектывізацыі вылучаны наступныя раёны: ...скі і ХОЙНІЦКІ (ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГІ), ЮРАВІЦКІ (МАЗЫР-...), СІРОЦІНСКІ (ВІЦЕБСКАЙ), СЬМІЛАВІЦКІ (МЕНСКАЙ АКРУГІ), ...ЯНСКІ (АРШАНСКАЙ АКРУГІ), ВЕТРЫНСКІ (ПОЛАЦКАЙ АКРУГІ), ...ЧЭЎСКІ і ЖЛОБІНСКІ (БАБРУЙСКАЙ АКРУГІ).

...ПОЎНАЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ЎСІХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ...ДАРАК ГЭТЫХ РАЁНАЎ ПАВІННА БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНА ДА ...АВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ, А МАГІЛЕЎСКАЙ АКРУГІ—ДА КАН-...ГО ГОДУ.

...Наркамзем, Калгасаюз і дзяржплян прыступаюць да скла-...ня пляну садзейнічаньня поўнай калектывізацыі гэтых раёнаў ...рамку іх забясьпечаньня сел.-гаспадарчымі машынамі і поўна-...карыстаньня сродкаў вытворчасьці уваходзячых бяднякка-...няцкіх гаспадарак у калгасы.

...Апіраючыся на імкненьне шырокіх рабочых мас Савецкай Бе-...і аказаць практычную дапамогу ў будаўніцтве буйных кал-..., ЦК КП(б)Б парашыў правесьці ВЫЛУЧЭНЬНЕ ПЕРШАЙ ЧАР-...ПШЫХ, МАЮЧЫХ ПАЛІТЫЧНА-АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ВОПЫТ, РА-...ІХ НА РАБОТУ ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. На працягу двух бліжэйшых м-цаў будзе вылучана 500 РАБОЧЫХ, якія будуць выка-...ны ў якасьці СТАРШЫНЬ БУЙНЫХ КАЛГАСАЎ, КУСТАВЫХ ...ДНАНЬНЯЎ, ЗАГАДЧЫКАЎ АСОБНЫМІ ВЫТВОРЧАСЬЦЯМІ КАЛ-...Ў (ТРАКТАРНЫЯ СТАНЦЫІ, МАЙСТЭРНІ), КІРАЎНІКОЎ КАЛ-...ЫМІ ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ і г. д.

...Вылучаныя рабочыя, перад накіраваньнем іх у вёску, пройдуць ...спэцыяльна арганізаваныя кароткa-тэрміновыя курсы-канфэ-...ні. Кожны вылучэнец атрымае бібліятэчку па пытаньнях сел.-...дарчай работы.

...ПОБАЧ З ШПАРКІМ РАЗГОРТВАНЬНЕМ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, ПА-...ОВА ЛІКВІДАВАЛАСЯ ПРЫШЧЭПАЎСКАЯ СПАДЧЫНА. Па зьве-...а за мінулае лета ЎВАЙШЛО Ў КАЛГАСЫ ЗВЫШ 5000 БЯДНЯЦ-...ЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

...БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ СЯЛЯНСТВА, ПРЫ ДАПАМО-...АБОЧЫХ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КП(б)Б ПЕРАМОГУЦЬ УСЕ ЦЯЖ-...ЦІ І ПЕРАБУДУЮЦЬ ВЁСКУ НА НОВЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЛАД.

Сэсія ЦВК СССР V скліку.

...та „Известия" ў перадавіцы пі-...2-я сэсія Цэнтральнага Выка-...а Камітэту Саюзу ССР 5-га скліканьня...ца ў момант, калі рабо-...бядняцка-сераднякія масы ся-...а пад кіраўніцтвам кампартыі ...юць рэшткі старога сьвету, штур-...ь апошнія пазіцыі капіталістыч-...элементаў у горадзе і на вёсцы. ...м ЦК УсеКП(б), які нядаўна ...ўся, даў вурок нагляднага на-...ня ўсім няўпэўненым. У сваёй ...цыі аб кантрольных лічбах на-...і гаспадаркі на 1929-30 год ён ...адхільныя зусім бясспрэчныя до-...ў тым, што ў нашай краіне ...аб'ектыўныя эканамічныя і па-...ныя ўмовы для таго, каб значна ...шпаркім тэмпам, чымся мы гэ-...окавалі паўгода назад, ісьці на ...сацыялістычнага будаўніцтва. ...ьцё і штодзённая практыка па-...ць нам, што нават найбольш ...альныя нашы разьлікі, зьвяза-...ажыцьцяўленьнем пяцігадовага ...разьвіцьця народнай гаспадаркі, ...атковы; шпаркі ўздым і творчая ...цыйная энэргія міліёнаў рабо-...батракоў, сялян-беднякоў і серад-...пераганяюць самыя сьмелыя ...ні і меркаваньні.

...ць хоць-бы калектывізацыю. Та-...істрымным патокам яна ідзе па ...Саюзу ССР, зьнішчаючы на сва-...яху старыя спрадвечныя сялян-...авыкі і звычаі: Беларусь будуе ...ы ў разьмерах, якія далёка пе-...аюць пяцігадовы плян. Паўноч-...ўказ дае ўрачыстае абяцаньне ...адна распачаць і распачынае ка-...візацыю наскрозь цэлых раёнаў ...таў. Такі-ж шпаркі тэмп калек-...цыі мы бачым і ў іншых част-...СФСР, на Украіне, у Сярэдняй ...ў Закаўказьзі. Адначасна Збож-...ст нязвычайна павялічвае сваё ...рчае заданьне. І гэта—дасягненьне ...гаральна апошніх тыдняў.

...сэсія ЦВК Саюзу ССР, якая ад-...ася 29-га лістапада, мае сваёй ...лай задачай аформіць і забясьпе-...ажыцьцяўленьне ўзятага партыяй ...ам тэмпу індустрыялізацыі кра-...На парадку дня стаяць 2 асноў-...выключнай важнасьці, пытань-...антрольныя лічбы народнай гас-...кі на 1929-30 год і адзіны дзяр-...ы бюджэт Саюзу ССР і саюзных ...блік. Ужо разгледжаны СНК Са-...ССР і пададзены на зацьвер-...не сэсіі праэкт адзінага дзяр-...га бюджэту Саюзу ССР дае ...авы думаць, што рэсурсы нашы ...ковы для намечаных тэм-...ндустрыялізацыі краіны, што вы-...ня сілы нашы нястрымна разьві-...ца і мацнеюць, бюджэт наш узра-...ў параўнаньні з мінулым годам ...4,8 проц., дасягаючы вялізарнай ...ютнай лічбы ў 11.390 міліёнаў. ...ькі рэальны гэтыя вылічэньні, ...а бачыць ужо з аднаго таго, што ...ютная камісія ЦВК Саюзу ССР у ...се папярэдняга разгляду гэтага ...ту бюджэту выкрывае новыя ...масьці, якія павялічваюць нашы ...ьтковыя выплаты.

...трольныя лічбы і дзяржаўны ...т, адлюстраваючы галоўную ўвагу фі-...ізацыі народнай гаспадаркі (фі-...ізацыя прамысловасьці павялічва-...а апроч асыгнаваньняў, якія ўва-...ходзяць у каштарысы ведамстваў і ўстаноў, на 93,3 проц.), адначасна ...ўлічваюць і дырэктыву апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы ...тэхнічных кадраў. Даволі зазначыць, ...што адно толькі капітальнае будаў-...ніцтва на вышэйшых і сярэдніх тэх-...нічных навучальных установах павя-...лічваецца ў параўнаньні з мінулым го-...дам на 273 проц.

Кантрольныя лічбы народнай гаспа-...даркі—гэта лемантар сацыялістычнага ...будаўніцтва. Яны павінны быць вядо-...мымі і вразумелымі для працоўных ...мас Саюзу ССР. У іх сухою моваю ...лічбаў апавядаецца гэраічная паэма ...барацьбы рабочай клясы і яе саюзь-...ніка працоўнага сялянства супроць ка-...піталістычнага сьвету.

Поруч з гэтымі двума агульнымі асноўнымі пытаньнямі на парадку дню сэсіі стаяць два спэцыяльных даклады: аб пляне разьвіцьця машынабудаўніцтва і трактарабудаўніцтва і аб утварэньні Народнага Камісарыяту Земляробства Саюзу ССР. Яшчэ лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) у 1928 годзе прызнаў, што сярод пастаўленых на чаргу гаспадарчых пытаньняў цэнтральным зьяўляецца пытаньне аб пашырэньні машынабудаўніцтва, якое зьяўляецца абавязковаю ўмоваю далейшага разьвіцьця краіны. Утварэньне агульна-саюзнага Наркамзему мае сваёй галоўнай задачай узмацненьне кіраўніцтва сацыялістычнай перабудовай сельскай гаспадаркі, якое ня можа быць вырашана іншымі мэтадамі кіраўніцтва, ужыванымі ў пэрыяд адналёньня, калі вырашалася пераважна задача ўзьняцьця індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

Вядомая рэч, што наша сацыялістычнае будаўніцтва мы можам праводзіць пры ўмове захаваньня міру з іншымі дзяржавамі і забясьпячэньня нашых межаў ад розных правакацыйных спроб з боку імпэрыялістычных дзяржаў. Вось чаму, зусім натуральна на надыходзячай сэсіі стаіць даклад аб нашым міжнародным становішчы. Рэдкі ў гісторыі па нагласьці налёт кітайскай васнішчыны на нашы межы і правакацыйныя выпады шэрагу краін супроць нашай дзяржавы і нашых грамадзян ня могуць не непакоіць рабочых і працоўных сялян Саюзу ССР. Для нас ня страшны ўрэшце гэтыя правакацыйныя выпады. Новы рэвалюцыйны ўздым у краінах імпэрыялістаў зьяўляецца для нас у гэтых адносінах належнай гарантыяй. Але мы ня хочам ніякіх перабояў у нашай працы. Мы не жадаем і не дапусьцім, каб адказныя ці безадказныя ўплывы ўносілі дэзарганізацыю ў наша будаўніцтва звонку.

ПАПРАУКА.

У № 270 газэты „Сав. Бел." на 4-ай стар. у паведамленьні аб адчыненьні 2-ой Сэсіі ЦВК СССР напісана:

1. „2) Справаздача бюджэтнай камісіі ЦВК Саюзу ССР аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюзу ССР на 1929-30 г. Дакладчык т. Тутгаєў", а трэба: „... т. Чуцкаеў";

2. „3) Даклад Нар. Кам. па Замежных Справах аб міжнародным становішчы Саюзу ССР. Дакладчык т. Любімаў", а трэба „... т. Літвінаў".

Сёньня адчыняецца Менская акруговая канфэрэнцыя ударных брыгад.

Менскай канфэрэнцыі ўдарных брыгад ад Цэнтральнага Камітэту КП(б).

БАЯВЫМ АТРАДАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА—УДЗЕЛЬНІКАМ МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНЫХ БРЫГАД—БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.

Першы год пяцігодкі ушчэнт разьбіў усе панікёрскія прадсказаньні правых апартуністаў.

Першы год пяцігодкі навочна паказаў, якія вялізарныя творчыя сілы маюцца ў нетрах рабочай клясы, навочна паказаў пераможную волю і настойлівасьць рабочае клясы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва савецкай краіны пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

„Вытворчасьць працы,—кажа т. Ленін,—гэта ў апошнім разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў вытворчасьць працы нябачную пры прыгоне, капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе пераможан тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую вытворчасьць працы".

«Мы павінны пранікнуцца тым працоўным энтузіязмам, тэй воляй да працы і ўпартасьцю, ад якога цяпер залежыць хутчэйшае ратаваньне рабочых і сялян, ратаваньне народнай гаспадаркі".

Сацыялістычнае спаборніцтва зараз зьяўляецца іспытаным мэтадам у руках працоўных для пасьпяховага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі камуністычнай партыі на індустрыялізацыю краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Вітаючы 1-ю менскую канфэрэнцыю ўдарных брыгад, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выказвае ўпэўненасьць, што недалёк той час, калі кожны цэх, кожнае прадпрыёмства Беларусі зьявяцца баявым атрадам удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва, магутная права працоўнага энтузіязму рабочай клясы!

Няхай жыве рабочая кляса, якая пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі будуе і пабудуе сацыялізм у нашай краіне і набліжае дзень перамогі камунізму ва ўсім сьвеце!

ЦК КП(б)Б.

ДА АКРУГОВАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ.

Сёньня адчыняецца Менская Акруговая Канфэрэнцыя ўдарнікаў. Канфэрэнцыі прадстаіць пад'агуліць вынікі масавай праверкі сац. спаборніцтва і вызначыць шляхі далейшага яго разьвіцьця. Матар'ялы рабочых брыгад па масавай праверцы лішні раз падцьвярджаюць, што сац. спаборніцтва цалкам апраўдала сябе, як новая форма працы і як лепшы мэтад камуністычнага выхаваньня рабочых мас.

Той вялікі ўздым працоўнага энтузіязму і зацікаўленасьць рабочых, якія праяўляюцца рабочымі масамі ў сац. спаборніцтве, добраахвотнае павялічэньне норм выпрацоўкі і зьнижэньне расцэнак абверглі ўсе прараканьні малаверыў з права-апартуністычнага лягеру аб невыкананьні нашых гаспадарчых задач. Гэты ўздым працоўнага энтузіязму паказаў, што асноўная маса рабочых усьвядоміла генэральную лінію партыі на індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Пэрыяд сацспаборніцтва даў нам ня толькі значны колькасны рост выпрацоўкі на нашых фабрыках і заводах, але і направіў у значнай меры тыя прабелы, якія меліся па якасных паказальніках у прамысловасьці на 1-е паўгодзьдзе 1928-29 году.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай партыі мы маем па галоўнейшых вучастках сац. будаўніцтва ня толькі выкананьне пляновых заданьняў, але і перавыкананьне іх.

Ініцыятыва рабочых мас вылілася ў адзін з лепшых мэтадаў сац. спаборніцтва—у арганізацыю ўдарных брыгад.

Па няпоўным даным з мейсц мы можам упаўне канстатаваць, што па шэрагу прадпрыемстваў сыстэма ўдарніцтва паступова пераходзіць у масавую сыстэму. Вось некалькі прыкладаў: ф-ка „Чырвоная Бярэзіна" налічвае 479 ударнікаў, ці 40 проц. да агульнай колькасьці рабочых; швэйная ф-ка «Кастрычнік» налічвае 296 ударнікаў, завод „Домбаль"—357 ударнікаў, ці 35 проц. да агульнай колькасьці рабочых.

Такіх прыкладаў можна прывесьці па шэрагу іншых прадпрыемстваў, але дастаткова ўказаць, што па 13 прадпрыемствам колькасьць ударнікаў дасягае 1550 чал. ці 25 проц. да агульнага складу рабочых гэтых прадпрыемстваў.

Побач з гэтым масавая праверка знайшла шэраг буйных недахопаў і адмоўных момантаў у сэнсе ўтварэньня на заводзе навакол ударніцтва і пасобных ударнікаў належнае вытворчае абстаноўкі і таварыскае атмасфэры.

Кіраўніцтва проф. арганізацый сац. спаборніцтвам у большай частцы насіла кампанійскі характар, сац. спаборніцтва не зьяўляецца асноўнай формай работы прафсаюзаў і адгэтуль вынік—што ня ўсімі праф. арганізацыямі у поўнай меры ўцямлена вялікае значэньне працоўнага ўздыму мас.

Слаба абстаіць са штодзённым кіраўніцтвам парт. ячэек сац. спаборніцтвам, а асабліва работай ударных брыгад і апошняе не стаіць яшчэ у цэнтры увагі работы парт. ячэек, а дзякуючы гэтаму недастатковае праяўленьне ініцыятывы і прыкладнасьці з боку асобных камуністаў і камсамольцаў, працуючых у вытворчасьці.

Праверка таксама паказала, што адміністрацыйны пэрсанал у цэлым шэрагу выпадкаў стаіць з боку ад сац. спаборніцтва, а у некаторых выпадках сваімі адносінамі тармазяць далейшае разгортваньне сац. спаборніцтва.

Слаба абстаіць справа у адносінах удзелу спэцыялістых у сац. спаборніцтве, ІТР, як правіла, ня былі ўцягнуты у актыўны удзел сац. спаборніцтва і ня было практычнай дапамогі з боку апошніх ударным брыгадам, рабочым вынаходцам і г. д.

Усе гэтыя недахопы павінны быць жорсткім чынам ускрыты праз рашучую пралетарскую самакрытыку і канфэрэнцыя ўдарнікаў павінна загастрыць увагу ўсіх арганізацый на адхіленьне перашкод на шляху да далейшага разгортваньня сацспаборніцтва. Усялякая коснасьць, якая праяўляецца з боку прафарганізацый і гаспадарнікаў, на якую наштурхаецца сацспаборніцтва, павінна быць катэгарычным чынам зьнішчана.

Неабходна весьці рашучую барацьбу з усімі тымі, якія перашкаджаюць выяўленьню і рэалізацыі ініцыятывы рабочых мас, з усімі рвацкімі настроямі, якія выходзяць ад адсталых груп рабочых і з усімі тымі, якія не садзейнічаюць далейшаму разгортваньню руху сацспаборніцтва.

Уся ўвага ўсёй рабочай грамадасьці павінна быць мабілізавана на стварэньне адпаведнай абстаноўкі для ўдарных брыгад. Уся работа ўсіх парт., праф. і гаспадарчых органаў павінна быць падпарадкавана агульным задачам сацспаборніцтва.

А. Розін.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Працоўныя Заходняй Украіны пратэстуюць супроць фашысцкай правакацыі.

МАГУТНАЯ РАБОЧАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ. ДЭМАНСТРАНТЫ РАЗГРАМІЛІ РЭДАКЦЫІ УНДА.

ВАРШАВА, 28-11. Правакацыйная кампанія, якую праводзіць УНДА, якое ўзяло на сябе ролю застрэльшчыка кампаніі супроць УССР і спачуваючых УССР элементаў на Заходняй Украіне, выклікала магутную хвалю пратэсту з боку працоўных Заходняй Украіны. Учора ў Львове адбылося некалькі дэманстрацыйных выступленьняў супроць ундаўскіх органаў друку.

Дэманстранты разграмілі рэдакцыю органаў УПДА „Новы Крок" і «Тыдзень», якія праводзяць вострую антысавецкую кампанію. Паліцыя разагнала дэманстрантаў і арыштавала некалькі чалавек. Арыштаваныя цяпер абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі на Заходняй Украіне. Украінскія фашысцкія студэнты намыкаліся адказаць на рабочыя дэманстрацыі другім выступленьнем супроць савецкага консульства ў Львове, шлях да якога, аднак, быў перагароджаны паліцыяй.

Выступленьне украінскіх рабочых супроць нацыянал-фашысцкіх органаў друку зрабіла ва ўкраінскіх і польскіх колах вялікае ўражаньне. Друк разглядае ўчарайшыя падзеі ў Львове, як адказ на налёт фашыстаў на савецкае консульства.

Нарада прадстаўнікоў згодніцкіх партый нацменшасьцяў

ВАРШАВА, 27-11. Учора ў памяшканьні клюбу УНДА (украінскае нацыянал-дэмакратычнае аб'яднаньне) у сойме адбылася нарада прадстаўнікоў згодніцкіх партый нацыянальных меншасьцяў з удзелам УНДА, украінскіх радыкалаў, украінскіх сацыял-дэмакратаў і украінскага сялянскага саюзу. З боку беларусоў на нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі групы Ярэміча, беларускіх хрысьтыянскіх дэмакратаў і беларускага праваслаўнага аб'яднаньня. Галоўным арганізатарам нарады зьяўляецца, вядомая рэч, лідэр УНДА Лявіцкі.

З палітычным дакладам на нарадзе выступіў Лявіцкі. Даклад пакуль што не агалошан, але водгук вестак з кулуараў нарады, Лявіцкі падкрэсьліў неабходнасьць асаблівай пільнасьці з боку нацыянальных меншасьцяў, якія знаходзяцца ў суседзтве з СССР, з прычыны «нявыразнасьці міжнароднага становішча паогул і магчымых падзей на савецкай Украіне, у прыватнасьці».

Нарада ўхваліла заснаваць больш шчыльнае супрацоўніцтва нацыянальных меншасьцяў. Дзеля гэтага ўчора абрана пастаянная камісія пагодженьня.

У палітычных колах разглядаюць учарайшае выступленьне нацыянальных меншасьцяў, у першую чаргу, з пункту гледжаньня яго міжнароднага значэньня, ня ўтойваючы, што яно, згодна намеру яго ініцыятараў, накіравана сваім вострым канцом супроць СССР.

ФАБРЫКАНТЫ ПАЗШ У ПОШУКАХ ТАННАЙ РАБОЧАЙ СІЛЫ.

НЬЮ-ЁРК, 27-XI. Не зважаючы на ўсе гутаркі аб «працьвітаньні», эканамічнае становішча Злучаных Штатаў выкрывае поруч з біржавым крахам і намечаным ужо скарачэньнем вытворчасьці—шэраг сур'ёзных хваравітых зьявішчаў. Сярод іх трэба адзначыць рост беспрацоўя, які выклікае трывогу буржуазнага і рэфармісцкага друку. Амэрыканскі капітал у пошуках высокіх дывідэнтаў пераносіць сваю вытворчую базу заграніцу, дзе рабочая сіла танейшая, чымся ў Злучаных Штатах.

Джутавая фабрыка з гораду Людлоу (у штаце Мэн) пераведзена ў Індыю, дзе рабочаму можна плаціць толькі 40-50 капеек за дзень. Форд пераводзіць вытворчасьць трактараў у Ірляндыю, „Джэнэраль Мотерс" набыла аўтамабільную фабрыку Спэля ў Нямеччыне. Налічваюць каля 2000 амэрыканскіх аддзяленьняў або самастойных амэрыканскіх фірм, якія працуюць паза Злучанымі Штатамі. Пры пераводзе адной толькі фабрыкі жалезных і скабяных вырабаў у Нямеччыну, адразу пазбаўлена працы 600 рабочых. Крыванёўны імпэрыялізм, які шукае вялікіх прыбыткаў, параджае новую пагрозную крыніцу беспрацоўя ў Злучаных Штатах.

ПАБУДОВА НОВЫХ КРЭЙСЭРАЎ.

ВАШЫНГТОН, 27-XI. Марское ведамства прадаўжае пабудаваньне 5-ці новых крэйсэраў, прадугледжаных нядаўна ўхваленым законам аб пабудове 15-ці новых крэйсэраў. У колах марскога міністэрства ня тоюць, што міністэрства ня спыняла пабудаваньне новых крэйсэраў, не зважаючы на надыходзячую лёндонскую канфэрэнцыю марскіх дзяржаў.

ПАРЫЖ, 28-XI. Гавас паведамляе: «Марская камісія палаты ўхваліла пададзены марскім міністрам Лейгам бюджэт на 1930 год. Бюджэт, устаноўлены ў разьмеры 2.583 міліёнаў франкаў,—меншы на 572 міліёны франкаў за бюджэт 1914 году.

СВОДКА З ФРОНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

ЗАПАЛКАВАЯ ФАБРЫКА „ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА" У БАРЫСАВЕ. Заданьне па зьнижэньню сабекошту прадукцыі фабрыка выканала поўнасьцю на 8,3 проц. Калі ў I паўгодзьдзі сабекошт быў зьнижан толькі на 3,7 проц., дык у II паўгодзьдзі ўжо на 12 проц. Прагулы зьнізіліся з 0,91 проц. у I квартале да 0,48 проц. у верасьні. Вытворчасьць працы за год павялічылася на 9,5 проц. супроць 5,4 проц. па пляну і 15 проц. па дагавору аб сацыялістычным спаборніцтве. Аднак, у IV квартале вытворчасьць працы павялічылася на 17 проц.

Прамфінплян „Чырвоная Бярэзіна" выканала на 103,7 проц.

* * *

ДРОЖДЖАВЫ ЗАВОД «КРАСНАЯ ЗАРЯ». За год сабекошт зьнижан на 20,3 проц. замест прадугледжаных плянам 17,3 проц і сацдагаворам—27,5 проц. Значнае дасягненьне завод мае ў галіне зьнижэньня процанту прагулаў: з 0,42 проц. у I квартале прагулы зьнізіліся да 0,08 проц. у верасьні. Вытворчасьць працы павялічылася за год на 35,7 проц. супроць 41 проц. па сацдагавору. Вытворчая праграма заводам выканана на 118,5 проц. Процант выхаду дражджэй складае 71,6 замест 65 прадугледжаных плянам.

* * *

ШПАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА. За год сабекошт прадукцыі зьнижан на 3,7 проц. замест пляновых 4,5 і па сацдагавору—5 проц. Аднак у III квартале рабочыя дабіліся зьнижэньня сабекошту на 5,7 проц. і ў IV—ужо на 8 проц. Значныя дасягненьні завод мае ў галіне зьнижэньня прагулаў: замест 1,56 проц. у I квартале—0,14 проц. у верасьні. Вытворчасьць працы за год павялічылася на 26 проц. Вытворчую праграму фабрыка выканала на 127 проц.

Кепская справа з бракам: замест 0,15 проц. па сацдагавору брак складае 0,34 проц.

* * *

СКУРАНЫ ЗАВОД „БАЛЬШАВІК". Сабекошт зьнижан на 5,5 проц. замест прадугледжаных сацдагаворам 10,7 проц. Ёсьць прыкметны пералом у IV квартале, калі сабекошт зьнижан на 7 проц. Прыкметны дасягненьні ў зьмяншэньні прагулаў: у I квартале 1,07 проц. і ў верасьні толькі 0,32 проц.

Вытворчасьць працы ўзрасла на 22,8 проц. супроць прынятых па сацдагавору 29 проц. Праўда, у IV квартале вытворчасьць працы павялічылася ўжо на 39 проц.

Вельмі кепская справа з нармірваньнем працы: замест запраэктаванага росту зарплаты на 3,4 проц., маецца рост на 15,6 проц.

Вытворчая праграма заводам выканана на 111 проц.

Кульгае якасьць прадукцыі.

* * *

ШКЛЯНЫ ЗАВОД ІМЯ „ДОМБАЛЯ". Замест прынятага па пляну і сацдагавору зьнижэньня сабекошту на 8 проц., за год маецца зьнижэньне ўсяго на 1,07 проц. Ёсьць пералом ў IV квартале, калі зьнижэньне сабекошту дасягнула 3,4 проц., што зьяўляецца недастатковым. Прагулы зьнижаны з 0,82 проц. у I кварт. да 0,45 проц. у верасьні.

Вытворчасьць працы захавалася на ўзроўні мінулага году ў той час, калі па сацдагавору ўзята абавязацельства павялічыць на 15 проц.

Ніякіх дасягненьняў у зьнижэньні браку няма: замест 5-12 проц. маецца за год 6-24 проц.

Вытворчая праграма выканана заводам на 110 проц.

* * *

ШКЛЯНЫ ЗАВОД „ПРАЛЕТАРЫ". Сабекошт прадукцыі зьнижан на 7,13 проц. замест 6 проц. па сацдагавору. Ёсьць дасягненьні ў галіне прагулаў. Адмоўныя вынікі ў адносінах браку: замест прынятых па сацдагавору 3 проц. на дробнаму начыньню брак складае 7,7 проц. і на буйнаму—9,5 проц.

Недастатковы вынік і ў адносінах вытворчасьці працы. Вытворчая праграма выканана на 108 проц.

Супастаўленьне прыведзеных паказчыкаў бярэ пад сумненьне зьнижэньне сабекошту на 7,13 проц.

* * *

МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА. Сабекошт па сацдагавору абяцаліся зьнізіць на 7,5 проц., а зьнізілі за год толькі на 4,8 проц. Фабрыка сярод іншых прадпрыемстваў дае найменшы процант прагулаў—0,04 проц.

Вытворчасьць працы павялічылася на 11 проц. супроць 18 проц па сацдагавору. У IV квартале вытворчасьць працы павялічылася ўжо на 16,5 проц.

Вытворчая праграма выканана на 111 процантаў.

Ненармальна тое, што процант браку павялічваецца. Кепска з якасьцю прадукцыі.

Што паказала праверка.

Ф-ка „Адраджэньне", Менск.

Зараз падагулены вынікі сац. спаборніцтва на нашай фабрыцы.

У апошні час палепшылася якасьць прадукцыі, зьменшаны брак. У ліцейным цэху, дзе брак быў да 35-40 пр. зараз зьніжаны да 5 проц. Сьлясарны цэх узьняў вытворчасьць працы на 35 проц., сабекошт зьнізіў на 30 проц.

Кульгае праца ў бляшаным і абойным цэхах ў сувязі з адсутнасьцю заказаў у належнай колькасьці. Група рабочых малярнага цэху дабраахвотна зьнізілі расцэнкі.

На фабрыцы пачалося перазаключэньні дагавораў на новых падставах.

Сьлесар.

„Няма патрэбы".

Ударныя брыгады—рэвалюцыйныя атрады вытворчасьці шырока разгарнулі сваю работу на фабрыках і заводах.

Ня тое наглядаецца на Эльводзе (Менск).

Нават са зьдзіўленьнем сустрэлі запытаньне:

— Як працуюць у вас ударныя брыгады?

— Іх у нас няма—чуем у адказ—бо дзеля гэтага няма ў гэтым патрэбы. Толькі палітычна-сьляпыя прафчынушкі могуць быць упэўнены, што ім няма сэнсу арганізаваць брыгады.

Ударныя брыгады на Эльводзе павінны быць арганізаваны!

Выпадковы.

Узнагароды—лепшым удзельнікам ударных брыгад.

За актыўны ўдзел у сацспаборніцтве атрымалі узнагароды 16 лепшых рабочых вытворчасьці Ф-кі „ПРАГРЭС". Прыкладны бісквітны цэх, у колькасьці 40 чал., атрымаў як падарунак—за добрую працу—часопісі „Нашы дасягненьні" і „Навука і тэхніка".

* * *

15 перадавых рабочых—удзельнікі ударных брыгад Ф-кі „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" за узорную працу атрымалі розныя прэміі на суму 82 рублі. Лепшай узорнай брыгадзе фабрыкі выпісаны цэнтральныя газэты на 6 месяцаў.

* * *

Камсамольцы-ударнікі Менскага хлебазаводу за прыкладнае выкананьне работы атрымалі прэм'і камсамольскія касьцюмы. Па заводу пры падагульваньні вынікаў сацспаборніцтва атрымалі прэміі 18 чал.

КАЛЕКТЫЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" НА ДАПАМОГУ „ЮМАНІТЭ".

Учора адбыўся агульны сход супрацоўнікаў газэты „Савецкая Беларусь", на якім было разгледжана пытаньне аб становішчы камуністычнай газэты Францыі—„Юманітэ".

Сход у прынятай рэзалюцыі ганьбіць тыя дзеяньні кіруючых і „сацыялісцкіх" колаў Францыі, якія накіраваны на тое, каб разбурыць камуністычны рабочы друк Францыі, у прыватнасьці орган ЦК КПФ—«Юманітэ».

Супрацоўнікі газэты «Савецкая Беларусь» на падтрыманьне „Юманітэ" адлічаюць свой аднадзённы заробак, што складае на ўвесь калектыў каля 120 рублёў і выклікаюць усіх членаў сэкцыі працаўнікоў друку зрабіць свае адлічэньні ў карысьць газэты „Юманітэ".

НАНКІН СПРАБУЕ АДЦЯГНУЦЬ ВЫРАШЭНЬНЕ КАНФЛІКТУ

Абмен нотамі.

МАСКВА. Учора 29-га лістапада нямецкі пасол у Маскве пан фон-Дырксэн перадаў т. Літвінаву ноту Нанкінскага ўраду ад 14-га лістапада, зьмест якой ужо памінаўся ў тэлеграме, надрукаванай у савецкай прэсе з замежных крыніц.

У той самы дзень Народны Камісар па Замежных Справах пераслаў нямецкаму паслу наступны адказ:

„Масква, 29 лістапада 1929 году.

Пан пасол! Маю гонар падцьвердзіць атрыманьне ноты нанкінскага ўраду ад 14-га лістапада, перададзенай вамі сёньня раніцою. Саюзны ўрад атрымаў ужо афіцыйнае паведамленьне ад маршала Чжан-Сюэ-ляна аб згодзе яго на папярэднія ўмовы, неабходныя для хутчэйшага вырашэньня канфлікту шляхам непасрэдных перамоў. Прапанова Нанкінскага ўраду, пададзеная ў памянёнай ноце, здольная толькі працягнуць канфлікт, ня мае такім чынам, значэньня.

Прымеце пан пасол завярэньні ў маім шчырым да вас паважаньні.

Літвінаў".

НА БАРАЦЬБУ З ЯЎРЭЙСКІМ ШАВІНІЗМАМ.

Пастанова бюро Мазырскага АК КП(б)Б.

Бюро Мазырскага АК КП(б)Б ухвалила спэцыяльную пастанову аб вылазках яўрэйскіх шавіністых па адкрытым сходзе па чыстцы гандлёва-каапэрацыйнай ячэйкі. Бюро канстатавала, што вылазка яўрэйскіх шавіністых на чыстцы ячэйкі зьяўляецца адкрытым выступленьнем клясавага ворага і што гэта вылазка і паўторныя факты шавіністычных выступленьняў на сходах па праверцы іншых ячэек (акрфа), завод «Змычка» і г. д.) і чыстцы савецкага апарату (Петрыкаў) яскрава даводзяць актывізацыю яўрэйскага шавінізму і нацыянал-дэмакратызму, выкліканую наступленьнем на капіталістычныя элементы.

Бюро адзначыла, што праявы ў акрузе яўрэйскага шавінізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму і вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляюцца вынікам актывізацыі кулацка-нэпманскіх элемэнтаў, якія аказваюць шалёнае супраціўленьне нашаму сацыялістычнаму наступленьню. У сувязі з гэтым бюро ўхваліла рад мерапрыёмстваў па правядзеньні масавай агітацыйнай работы па растлумачэньні сярод працоўных мас контр-рэвалюцыйнай сутнасьці яўрэйскага шавінізму, нацыянал-дэмакратызму і антысэмітызму. Бюро прапанавала фракцыі АПБ правесьці масавыя сходы рабочых па саюзах і прадпрыемствах гораду, дзе абмеркаваць даклады аб клясавай сутнасьці і шкоднасьці шавінізму ўсіх колераў, шырока растлумачваючы сапраўдную сутнасьць вылазкі клясавага ворага на праверачных сходах па чыстцы ячэек. Такія-ж сходы будуць праведзены сярод самаатужнікаў. У бліжэйшы час склікаецца нечарговы пленум АК, які абмяркуе пытаньне аб праявах нацыянал-дэмакратызму, яўрэйскага шавінізму і аб далейшых задачах арганізацыі. Бюро даручыла АПАД АК разгарнуць шырокую распрацоўку пытаньня аб контррэвалюцыйнай сутнасьці бундызму і інш. дробна буржуазных партый і максымальна ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Бюро АК даручыла ўсім РК, ячэйкам і фракцыям устаноў узяць рашучы курс на правядзеньне беларусізацыі ва ўсіх установах і арганізацыях. Фракцыя пацкамісіі ў бліжэйшы час прыступае да праверкі выкананьня дырэктыў аб беларусізацыі савецкага, прафэсыянальнага і каапэрацыйнага апаратаў.

Аб рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную.

Інфармацыя тав. Конанава на 2-ой Сэсіі ЦВК БССР.

Апарат перад новымі задачамі.

Таварышы, пытаньне рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай акругі выцякае з тых задач, якія зараз стаяць перад савецкім апаратам, якія партыя і ўрад паставілі перад савецкім апаратам пры ажыцьцяўленьні чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, Сэсія ЦВК ужо мела магчымасьць заслухаць сёньня даклад аб чыстцы савецкага апарату, і ў гэтым дакладзе ў асноўным высьветліла тыя пытаньні, якія партыя паставіла, як задачу ў сучасны момант.

Гэтыя пытаньні магчыма зьвязаны з агульнай задачай выкананьня нашым дзяржаўным апаратам пяцігадовага пляну і тых клясавых баявых задач у галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі і індустрыялізацыі краіны наогул.

Таму, калі партыя і дзяржава ставіць задачу палепшаньня гэтага апарату, дык ява ідзе па двух асноўных лініях: з аднаго боку аздараўленьне і палепшаньне асабістага складу апарату, з другога боку рэорганізацыя гэтага апарату, правядзеньне яго ў адпаведнасьць з тымі запатрабаваньнямі і тэмпамі будаўніцтва, якія мы ажыцьцяўляем у сучасны момант.

Таму, зусім зразумела, што тыя мерапрыемствы, якія праводзіць зараз урад у адносінах да Віцебскай акругі, павінны зьявіцца першым крокам, першым вопытам, дзеля таго, каб на прыкладзе Віцебскай акругі, вывучаючы, удасканальваючы ўсю сыстэму, у далейшым надзвычайна абгрунтована можна было гэтыя вопыты перанесьці і на увесь дзяржаўны апарат.

Сэсія ЦВК будзе мець магчымасьць сёньня заслухаць і разглядзець пытаньне аб тым, што-ж канкрэтнага ўносіць гэта новая рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва, з тым, каб даць адпаведную ацэнку, наколькі мэтазгодна гэта новае, наколькі мэтазгодна гэта, пры наяўнасьці ўдзелу ў гэтай справе рабочых мас, батрацкага, бядняцкага і серадняцкага сялянства, ажыцьцяўляць. І мне ў зьвязку з гэтым прыдзецца ў кароткіх рысах азнаёміць Сэсію з тымі мерапрыемствамі і меркаваньнямі, якія заложаны ў падставу правядзеньня рэорганізацыі сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай акругі.

Тэмпы работы апарату прыстасаваць да тэмпаў будаўніцтва.

Мы з вамі ведаем, што ў прыродзе нашага дзяржаўнага апарату, у самім існаваньні нашай дзяржаўнасьці заложана тое, што дзяржаўны апарат зьяўляецца сродкам у руках рабочае клясы для ажыцьцяўленьня тых задач, якія праводзіць партыя і рабочая кляса. І таму зразумела, гэты апарат павінен быць цалкам прыстасаван і прыведзен у адпаведнасьць з запатрабаваньнямі, якія прад'яўляе да яго рабочая кляса і партыя. Аднак, на сёньняшні дзень, як гэта неаднаразова гаварылася ўжо, у нашым апараце на вялікі жаль ёсьць шэраг недахопаў, якія мы з усёй відавочнасьцю выкрываем на прыкладзе Віцебскай акругі. Недахопы гэтыя галоўным чынам датычацца таго, што наш апарат яшчэ ня поўнасьцю ажыцьцяўляе задачы гібкага, хуткага і дасканалага абслугоўваньня запатрабаваньняў шырокіх пралетарскіх мас, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх колаў вёскі.

У нашым апараце на сёньняшні дзень маем яшчэ цэлы шэраг структурных награмаджэньняў, якія ствараюць зацяжкі ў праходжаньні тых пытаньняў, якія датычацца непасрэдна абслугоўваньню працоўных і звароту працоўных да гэтага апарату. Усе гэтыя моманты падлягаюць зьнішчэньню. Што-ж мы наглядаем у сучасны момант пры тым, калі Віцебская акруга ў ліку 5 акруг па Савецкаму Саюзу вылучана спэцыяльна для пастаноўкі вопыту рацыяналізацыі сыстэмы кіраўніцтва?

Папершае, мы туг выкрылі з усёй вялавочнасьцю недахопы ў самой сыстэме, і гэтыя недахопы ў асноўным зводзяцца да таго, як я ўжо раней зазначыў, што наш апарат не адпавядае новым запатрабаваньням па выкананьню чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Падругое, мы выкрылі неадпаведнасьць тэмпаў работы апаратаў да тых задач, якія стаяць на сёньняшнім этапе.

Патрэцяе—множнасьць інстанцый пры вырашэньні тых ці іншых пытаньняў, што стварае цяжкасьці і займае шмат часу.

Пачацьвертае—зусім дрэнае плянаваньне. Гэта значыць, што наш апарат не прыстасован да таго, каб ужываць адзін з спосабаў правільнага рэгуляваньня і правільнага кіраўніцтва нашай народнай гаспадаркай, усёй нашай работай, што мы ажыцьцяўляем пры дапамозе плянаваньня. Мы зараз без пляну ня можам ступіць ніводнага кроку, без вучоту не можа быць ніякай работы. Так што ў гэтым гапрамку мы маем значныя недахопы у апараце якія павінны быць зьнішчаны з тым, каб апарат быў перабудован па такой сыстэме, каб ён забясьпечваў хуткае плянаваньне правядзеньня ўсіх мерапрыёмстваў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, а гэта можа быць дасягнута ў тым выпадку, калі мы будзем мець адпаведнае забясьпечэньне сіламі, калі мы будзем мець такую пабудову самой структуры і сыстэмы апарату, якая будзе ўключаць у сябе гэты асноўны элемэнт плянаваньня, як вучот, статыстыка і г. д.

Цэнтры работы пераносяцца ў раёны.

Якую-ж мэту ставіць перад сабой рэарганізацыя Віцебскай акругі ў вопытную акругу і што мы гэтай рэарганізацыяй дасягнем?

Выконваючы задачы пастаўленыя XVI партканфэрэнцыяй мы павінны будзем рэарганізаваць апарат так, каб значная доля рэарганізаваных апэрацыйных функцый з акруг была перадана ў раёны, а з раёнаў у сельсаветы, з тым, каб гэтым самым узмацніць, зрабіць больш самастойнымі кіруючымі адзінкамі нашы раёны і сельсаветы, перадаўшы ў горадзе гэтыя функцыі гарадзкому савету, а ў раёнах—райвыканкомам і сельсаветам.

Зараз праведзена рэарганізацыя так, што праца акрвыканкому ўкладваецца ў такія рамкі, калі ад яго амаль што поўнасьцю адпадаюць апэрацыйка-гаспадарчыя функцыі, застаўляючы за ім толькі функцыі кіраўньня. Гэта значыць: плянаваньне, кантроль над выкананьнем і інструктаж. Усе астатнія функцыі ў гарадох перадаюцца гарадзкому савету, а ў раёнах—райвыканкому.

Гарадзкому савету ў межах гораду перадаюцца ўсе культурныя і лекавыя ўстановы, гарсавету надаюцца ўсе правы кіраваньня прамысловасьцю.

Прычым утварэцца дзьве гарадзкія інспэкцыі: камунальная і мясцовай прамысловасьці, а ў раёнах уся раённая прамысловасьць цалкам падпарадкоўваецца райвыканкомам, дзе ўтварэцца прамысловы камбінат. Таксама за акрвыканкомам застаецца агульнае кіраваньне ў парадку тэхнічнай кансультацыі, у парадку агульнага нагляду і кантролю за выкананьнем, а самастойным гаспадаром у поўным сэнсе гэтага слова зьяўляецца гарадзкі савет.

Колькасна апарат гарадзкога савету ўзмацняецца за лік скарачэньня акруговага апарату. Акрамя таго, яшчэ апарат Гарсавету ўзмацняецца пэўнай колькасьцю спэцыялістых, якіх да гэтага часу нават ня мелі і акрвыканкомы.

Райвыканкомам надаюцца правы непасрэднага плянаваньня ў межах раёну, асноўнымі галінамі сельскай гаспадаркі. Таксама пашыраюцца правы адносна падатковых мерапрыемстваў—самаабкладаньня, с.-г. падатак, а таксама дасцца поўная самастойнасьць ва ўсіх пытаньнях культурнага будаўніцтва і за РВК ў гэтым сэнсе застаюцца функцыі плянаваньня, інструктажу і кантролю за выкананьнем.

Сельсавет у значнай ступені таксама узмацняецца, набывае самастойнасьць і становіцца самастойнай адзінкай у сэнсе непасрэднага гаспадарнічаньня ў межах сельсавету. Зараз сельсавет, напрыклад, па земляўпарадкаваньню (гідратэхніка, культтэхніка і торф) мае свае правы і функцыі, якіх ён раней ня меў, гэтыя функцыі ён мае і ў справе земляўпарадкаваньня прыём заяў, непасрэднае складаньне вытворчых плянаў па земляўпарадкаваньні, нагляд за правільным выкананьнем плянавых заданьняў, разьмеркаваньне льгот па земляўпарадкаваньні.

Штат сельсавету, з прычыны таго, што яму надаюцца большыя права, таксама павялічваецца двума працаўнікамі.

Калі ўзяць бюджэт, тут мы таксама бачым значнае ўзмацненьне праў сельсавету, хаця-б у тым, што ва ўсіх сельсаветах павінны быць свае самастойныя сельскія бюджэты, чаго да гэтага часу ня было.

Гэтыя некалькі прыкладаў з усёй яскрасьцю паказваюць, што сельсавет становіцца больш самастойнай адзінкай, становіцца гаспадаром у сваіх межах. Вядома, што калі перадаецца больш аб'ектаў працы, то бязумоўна, што патрэбна ўзмацненьне апарату сельсавету, каб ён мог справіцца з гэтымі задачамі. Сельсавет узмацняецца двумя новымі працаўнікамі—па рахункаводству і статыстыцы.

Таксама зарплата працаўнікоў сельсавету будзе даведзена да 40 руб. у месяц.

Пры кожным сельсавеце арганізуецца сельскі суд, якому зараз прыдаецца значная частка грамадзкіх і дробна-крымінальных спраў, пры сельсаветах утвараюцца таксама таварыскія суды, якія будуць мець выхаваўчае значэньне.

Стаўка на ўцягненьне ў гэтыя суды і на выхаваньне для ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнай законнасьці ўжо будзе мець вялікае значэньне для саміх бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Узмацняецца пэрсанальная адказнасьць.

У раёне, у асноўным зьмены ідуць па лініі зьнішчэньня прамежутачных інстанцый. Пры правядзеньні новай функцыянальнай сыстэмы на прынцыпе пэрсанальнай адказнасьці, абавязкі разьмяркоўваюцца паміж асобнымі 4 работнікамі РВК разьмяркоўваюцца так: старшыня, яго два намесьнікі і сакратар, якія самі нясуць адказнасьць за выкананьне задач у кожнай галіне, якія ўваходзяць у яго функцыі. Гэтым мы дасягаем значных зьмен у напрамку ўзмацненьня асабовай адказнасьці паасобных кіраўнікоў, узмацняем асабовую адказнасьць непасрэдных выканаўцаў. РВК да гэтага часу, як вы ведаеце, у кожным аддзеле меў загадчыкаў, які адказваў як кіраўнік. Тэхнічны склад яго—дзелавод, сакратар, адказвалі толькі за самую тэхніку, зараз-жа пры сыстэме адказных выканаўцаў гэты апарат адказвае ня толькі за напісанае ў паперцы, а за яе выкананьне. Праведзеная частковая рэарганізацыя ў 1927 г. закранула толькі частку ведамстваў. Гэта па лініі НКАсьветы, па лініі аховы здароў'я, сацыяльнага забясьпечаньня, калі былі ліквідаваны аддзелы, а замест іх была арганізавана акруговая інспэктура. Цяпер сыстэма акруговага апарату грунтоўным чынам зьмяняе ўсё. Аддзелы зьнішчаюцца і замест іх праводзіцца ўзваная функцыянальная сыстэма, адказных выканаўцаў, пры пасрэдніцтве якой будзе плянавасьць і кантроль выкананьнем. Тут уся работа будзе весьціся па прынцыпу жывога ліку, тажу замест таго папяровага каналу кіраўніцтва, які быў да гэтага часу.

Гэта функцыянальная сыстэма кіраўніцтва канструіруецца ва ўсіх акказаньні дапамогі ў паасобных галінах мерапрыёмствах. За гэты кошт у гарсаветы, райвыканкомы і сельсаветы. Вось лічбы, якія аб гэтым гаварылі мы раней у акруговых апаратах 416 адзінак, то пасьля рэарганізацыяй і судом мелі 423, зараз у сельсаветах было 317, зараз 420.

Тут пытаньне штатаў, скарачэньня мы сабе мэтаю ня ставілі пакуль гэта зьяўляецца мэтай рэарганізацыі.

У пытаньні штатаў мы нават мелі значнае павялічэньне па ўсяму сельсаветаў, РВК і АВК—на 29 але значнага ўдаражэньня апарату ня выклікае паколькі ўдаражэньне галоўным чынам за кошт павышэньня зарплаты нізавым сельскім працаўнікам.

Пытаньне аб кадрах зьяўляецца важнейшым пытаньнем.

Хоць мы людзей ужо распасадзілі, але недахват людзей на сёньняшні дзень вялікі і асабліва спэцыялістых, паколькі мы бярэм курс на больш кваліфікаваных, больш сталых работнікаў і тут прыдзецца прыцягнуць значную долю спэцыялістых для работы як у самім акруговым апараце, так і ў райёне.

Усе тыя мерапрыёмствы, якія зараз правёў Віцебскі АВК і кіруючыя партыйныя органы, яны ў межах мажлівасьцяй, у Віцебскіх умовах зьяўляюцца максымальнымі. Але гэтым пытаньне не вырашаецца. Нам зараз ужо прыходзіцца сустракацца з неабходнасьцю кідкі людзей за кошт іншых аддзелаў, кошт іншых месц, паколькі на гэтых кадраў, асабліва спэцыялістаў хапае.

Трэба думаць, што з гэтымі мерапрыёмствамі мы ўсё-ж пры агульным выкананьні дапамогі ў паасобных галінах і каштоўнасьці гэтых мерапрыемстваў справімся, але зноў папярэдзім, што гэта будзе зьяўляцца і зьяўляецца фактычна галоўнейшай цяжасьцю, якая нам прыдзецца перамагаць.

Як праведзена падрыхтоўчая работа.

Я зараз кароценька хачу спыніцца на тым, як жа мы органы РСІ, на якіх непасрэдна ўсклазена ажыцьцяўленьне гэтай задачы, а таксама мясцовыя і акруговыя органы, спраўляемся з гэтай працай і задачай па ўцягненьню ў гэту справу шырокіх мас.

Уся папярэдняя работа, падрыхтоўчая работа, якая праводзілася на працягу некалькіх месяцаў, бязумоўна мае агромністае значэньне ў сэнсе ўцягненьня партарганізацый, камсамольскіх арганізацый, батракоў, бедняцка-серадняцкай часткі вёскі да гэтай работы, але з тым мы лічым яшчэ гэту работу недастатковай.

Таму, на сёньняшні дзень, калі ўжо галоўным, гэта праца скончана, усе зьмены праведзены, трэба ўжо пра ажыцьцяўляць, то гэта ажыцьцяўленьне пасьляховым будзе тады, калі і будуць прымаць удзел непасрэдна масы, калі тут будзе створана сацыяльнасьць і іменна на падставе гэтага ўдзельнічаньня мы разгорнем

Цэнтральныя ўстановы і Віцебшчына.

Цэнтральныя Наркаматы ня гледзячы на тое, што прашло шмат часу, пакуль што палец аб палец не ўдарылі, каб мала-мальскі дапамагчы Віцебскім мясцовым арганізацыям у іх рабоце. Напрыклад, яшчэ на сёньняшні дзень усякія паперкі цэнтральныя ўстановы пасылаюць па старынцы ў Віцебскае Акрэна, у Віцебскі Акрфа і г. д., хоць гэтых акруговых аддзелаў ужо няма, а функцыі іх перайшлі ад АВК да РВК і гарсаветаў. Выходзіць нейкая несуразіца. У мяне ёсьць шэраг характэрных прыкладаў, але я ня маю часу іх прывесьці. Напрыклад, Наркамзем піша ўсім Акрэа, у тым ліку і Віцебскаму, якога даўно ўжо ня існуе, піша па пытаньню аб персанальным складзе, ня гледзячы на тое, што гэтыя справы ўжо залежаць ад РВК, а не ад акругі. Значныя цэнтральныя ўстановы не ўсьведамілі яшчэ тых функцый, якія значна зьмяніліся па Віцебскай акрузе.

Яшчэ заўвага адносна таго, што ўся работа па рэарганізацыі Віцебскай акругі праводзіцца па глебе сацыялістычнага спаборніцтва з іншымі акругамі Савецкага Саюзу, дзе таксама праводзіцца гэтая рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва, як напрыклад Курск, Зіноўеўск, Арцёмаўск, Чэлябінск.

Трэба адзначыць, што ў гэтым спаборніцтве пераварэ, пакуль што, застацца за намі ў сэнсе якасных паказчыкаў. Вось напрыклад лічбы па штатах гаворыць, што ў той час, калі ў Віцебскай акрузе АВК мае 90 штатных адзінак, Курск мае 96. Зіноўеўск—140; Віцебская акруговая РСІ мае 10 адзінак, Курск—15. Зіноўеўск—20 і г. д. Па суду таксама у нас 32, а у тых двух акругах—46. Іншыя акругі, дзе праводзіцца гэты вопыт застаюцца амаль што роўнымі. Праўда, тут могуць паставіць пытаньне, што ў тых акругах быццам больш аб'ектаў і таму апарат там больш вялікі. Я павінен сказаць, што розьніца ў аб'ектах тут невялікая, але справа ў тым, што мы свае штаты і раней ішлі з больш меншымі штатамі, чым тыя акругі. Так што у нас скарачаць далей ужо няма, а тыя акругі яшчэ не дабіліся таго, трэба было-б дабіцца ў парадку ацыялізаньня соцыялістычнага сектара.

Мы працаўнікі РСІ, непасрэдна ўдзельнічаючыя па ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў рэарганізацыі Віцебскай акругі, таксама віцебскія савецкія парт. прафэсыянальныя арганізацыі, ажыцьцявіць гэтыя задачы, зразумела, непасрэдным шырокім удзеле мас. Пры гэтай умове, калі мы будзем пераправеряць, што нашыя мерапрыемствы ня ўпустую, што нашы мерапрыемствы будуць дасканала вывучацца, з тым, што вопыт можна было пашырыць на ўсе зьмены самой структуры кіраўніцтва нашым апаратам, дзеля лепшага арганізаваньня пралетарскіх мас і бедняцка-серадняцкіх мас з тым, каб гэты вопыт адпавядаў тым запатрабаваньням сацыялістычнага будаўніцтва, які ставіць сучасным этапе. Увесь наш вопыт мела зьяўляецца каштоўнай рэчаю ве палепшаньня апарату, але на толькі адным наша работа ня можа чыцца; гэта толькі адзін сьмелы крок шляху адшуканьня новых спосабаў лепшаньня нашага савецкага апарату. Справа рацыяналізацыі апарату, і саваньня яго да выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва павінна і лей стаяць у цэнтры увагі партыі і савецкіх арганізацый, бо толькі агульнымі сіламі пры актыўным удзеле мас у гэтых мерапрыемствах, мы пасьляхова закончыць работу. Я юся, што Сэсія ЦВК разглядаючы пытаньне сёньня згадзіцца з тымі тычнымі мерапрыемствамі, якія прымуць урадам па гэтаму пытаньню і з тэтна зьвярнецца з адозвай да рабоча мас, з тым, каб стварыць грамадзкую думку, прыцягнуць ініцыятыву працоўных, і тады мы да канца ажыцьцявім мерапрыемствы, якія вызначаны прыняцьцем Віцебскай акругі у вопытную акругу і пашырым гэты вопыт у ўсім сыстэму нашага дзяржаўнага апарату.

Поўная дэмаралізацыя кітайскага войска.

АРМІЯ АБЯРНУЛАСЯ У БАНДЫ РАБАЎНІКОЎ.

Салідарнасьць сусьветнага пралетарыяту з СССР—сапраўдны пакт міру.

ПАРЫЖ, 27-11. «Эўр» (блізкая да міністэрства замежных спраў) прызнае, што Мукдэн парушыў захопам УК чыгункі свае міжнародныя абавязацельствы, якія закранаюць ня толькі савецкія інтарэсы. Газэта адхіляе налічча стану вайны на савецка-кітайскай мяжы, характарызуючы стычкі, як узаемныя напяружваючыя дзеяньні.

„Юманітэ" зазначае, што рашучы ўдар Чырвонай арміі кітайскай генэральшчыне і расейскім белагвардзейцам быў неабходным законным адказам на нясупынныя правакацыі, гвалты і налёт на савецкую тэрыторыю. У адказе на артыкул рэфармісцкай „Пэпль" газэта „Юманітэ" характарызуе яго, як непасрэдны зварот рэфармістаў да імпэрыялістаў з заклікам умяшацца ў савецка-кітайскі канфлікт. „Юманітэ" падкрэсьлівае, што францускі пралетарыят цалкам салідарны з кожным крокам Чырвонай арміі, лічачы, што адзіным, сапраўдным міжнародным пактам міру зьяўляецца салідарнасьць сусьветнага пралетарыяту з Савецкім Саюзам у барацьбе супроць імпэрыялізму.

Гамбурскі пралетарыят вітае Далёка-Ўсходнюю з перамогай.

БЭРЛІН, 27-XI, Канфэрэнцыя партактыву Гамбурскага раёну ўхваліла тэкст тэлеграмы на адрас камандаваньня Далёка-Ўсходняй арміі. У тэлеграме зазначана: «Рэвалюцыйны пралетарыят Гамбургу з захапленьнем сочыць за барацьбою адважнай Чырвонай арміі супроць ураду Чан-Кай-Шы і вітае зьнішчэньне белагвардзейскіх банд. Рэвалюцыйны пралетарыят Гамбургу гатоў усімі сіламі абараняць Савецкі Саюз.

Няхай жыве непераможная Чырвоная армія!

Няхай жыве Камінтэрн!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

На гэтым самым сходзе ўхвалена паслаць тэлеграму пратэсту супроць фашысцкага клясавага суду ў Баўгарыі і прывітальную тэлеграму 57-мі удзельнікам працэсу баўгарскіх рэвалюцыянэраў.

Нанкінцы не зрабілі ніякіх заяў.

ШАНХАЙ, 28-11. Паведамленьне аб тым, што мукдэнскі ўрад згадзіўся на ўсе ўмовы, прапанаваныя савецкім урадам, яшчэ не агалошана ў мясцовых газэтах. Аднак, гэтыя весткі шпарка распаўсюдзіліся па ўсім горадзе і зрабілі ва ўсіх палітычных колах вялізарнае зьдзіўляючае ўражаньне.

Нанкінскія дзеячы, на якіх паведамленьні аб дзеяньнях Мукдэну зрабілі зьнішчаючае ўражаньне, пакуль што не зрабілі ніякіх заяў аб сучасным становішчы.

Кітайскае войска падпаліла г. Хайлару.

ВАШЫНГТОН, 27-11. Уцекачы з Хайлару падцьвярджаюць паведамленьні, што кітайскае войска перад адступленьнем разрабавала і падпаліла горад. У Харбіне—перапуд. Кітайская гандлёвая палата зьвярнулася з просьбаю да мясцовай улады запрасіць чужаземнае войска, калі кітайскія салдаты паспрабуюць рабаваць Харбін.

Поўная дэзарганізацыя ў кітайскім войску.

ТОКІЁ, 28-11. Як паведамляюць з Харбіну, падзеі на заходняй лініі УК чыгункі зусім развагалі вайсковы і чыгуначны апараты і былі растлумачаны кітайцамі, як далёкае прасоўваньне савецкага войска на кітайскую тэрыторыю. У выніку—вялізарная лавіна адступаючых, парушэньне сувязі з часьцямі, поўнае няведаньне месца знаходжаньня савецкага войска. Вялізарны раён да Хэйлару быў вызвалены ад войска.

Тэрыторыя ў 150 кілёмэтраў аказалася бяз войска. Насельніцтва іранізуе над кітайскім камандаваньнем. Кітайскі друк, з мэтаю паслабіць уражаньне, пусьціў чуткі, нібыта адступленьне мае палітычныя мэты даказаць, што СССР парушыў пакт Кэлёга, распачаўшы вясны наступ пры пасыўнай пазіцыі кітайскага войска.

Кіраўніцтва чыгункай перайшло да „ўлады на мясцох".

ТОКІЁ, 28-11. Як паведамляюць з Харбіну, там у апошнія дні ў сувязі з эвакуацыяй стоўпілася больш за 12 тысяч уцекачоў. Паязды ходзяць цяпер да Буxеду. Раён на захад ад Буxеду абвешчан ваенным зонай. Каля Хайлару пансаван мост. На станцыі Якешы здарылася буйнае крушэньне таварнага поезду, 6 вагонаў зыйшло з рэек; гэта выклікала часовы перарыў руху.

Кіраўніцтва чыгункі страціла кантроль над лініямі. Часткова кантроль перайшоў да ваеннага камандаваньня, а ў асноўным да „улады на мясцох».

Бунт і павальныя рабункі кітайскіх войск.

ТОКІЁ. Як паведамляюць з Харбіну, 15 тысяч кітайскіх салдат зусім дэмаралізаваны і адступаюць на захад. Перапуд ахапіў таксама прысланыя ў Хайлар новыя часьці. Сярод некаторых вайсковых часьцей пачаўся бунт і павальныя рабункі. Адміністрацыя УК чыгункі накіравала ў Хайлар парожны поезд для эвакуацыі насельніцтва, аднак, ён быў захоплены салдатамі.

„Тан" нездаволен.

ПАРЫЖ, 28-11. У перадавіцы, прысьвечанай савецка-кітайскаму канфлікту, „Тан" прымушан з нездаваленьнем прызнаць—разам з усім афіцыёзным друкам—немагчымасьць рэальнага ўмешваньня ні Лігі Нацый, ні ўдзельнікаў пакту Келёга ў савецка-кітайскі канфлікт з мэтаю зрабіць які-небудзь нажым на савецкі ўрад.

Пазіцыя Японіі.

ТОКІЁ. „Цзы-Цзы" прысьвечвае перадавыя артыкулы сучаснаму становішчу савецка-кітайскага канфлікту. Газэта выказваецца супроць умешваньня дзяржаў у савецка-кітайскі канфлікт і раіць Японіі ня ўжываць у Манчжурыі ніякіх захадаў, апроч абароны японскіх рэзыдэнтаў.

* * *

ТОКІЁ, 28-11. Агэнцтва Сімбун Рэнго паведамляе: „Кітайскі пасланьнік у Японіі наведаў японскага міністра замежных спраў Сідэхару. Як перадаюць, Сідэхара раіў пасланьніку не дамагацца пасрэдніцтва ў Лізе Нацый, бо Савецкі Саюз не зьяўляецца сябром Лігі".

Бастуе 4 тысячы гарнякоў.

ПЕКІН, 28-11. Водлуг паведамленьня агэнцтва Сімбун Рэнго з Мукдэну, 4 тысячы рабочых цяньшаньскіх вугольных капальняў абвясьцілі забастоўку. Яны патрабуюць палепшаньня ўмоў працы і лепшых абыходзін з боку адміністрацыі. Улада выслала на рудзікі атрады чыгуначнай варты і паліцэйскія сілы для ўзмацненьня мясцовага гарнізону.

Кантон напярэдадні падзеньня.

ЛЁНДАН, 28-11. Ганконскі карэспандэнт «Таймса» паведамляе, што Кантон знаходзіцца пад пагрозаю падзеньня. Настрой у горадзе вельмі трывожны.

Посьпех паступовай палітыкі савецкага ўраду.

БЭРЛІН, 28-11. Орган дэмакратычнай партыі „Бэрлінэр Тагеблят" зазначае, што капітуляцыя Кітаю зьяўляецца посьпехам паступовай палітыкі савецкага ўраду. „Перад несправядлівасьцю, учыненай Савецкаму Саюзу Кітаем,—піша газэта,—кіраўнікі замежнай палітыкі СССР далі прыклад дзяржаўнай мудрасьці, выявіўшы стрыманасьць, якая дала магчымасьць ім да канца дамагацца свайго першага рашэньня.

Арганізацыя „батальёнаў сьмерці".

ТОКІЁ, 28-11. Водлуг паведамленьняў з Харбіну, цыцыкарскі дубань Ван-Фу-Лін сьпешна фармуе «батальёны сьмерці» з удзелам расейскіх белагвардзейцаў.

Без умяшаньня трэцяй дзяржавы.

ПЭЙПІН, 28-11. Увесь пэйпінскі і цянцзінскі друк дамагаецца, каб канфлікт быў вырашаны непасрэдна паміж Кітаем і СССР без умяшаньня трэцяй дзяржавы.

Барацьба пралетарыяту у буржуазных краінах

Дэманстрацыя лёкаутаваных рабочых.

ПАРЫЖ, 28-11. Водлуг паведамленьня Гаваса з Антвэрпэну, зачыненьне антвэрпэнскіх фабрык і майстэрняў на шліфоўцы дыямэнтаў закранае 12 тысяч рабочых. Прадпрыёмцы дамовіліся з правадырамі меншавіцкіх прафсаюзаў аб выдачы лёкаутаваным рабочым тыднёвай дапамогі ў разьмеры 250 бэльгійскіх франкаў (франк—каля 8 кап.) з спэцыяльнай касы страхаваньня ад беспрацоўя, заснаванай прафсаюзам з удзелам прадпрыёмцаў. Абураныя рабочыя-гранільшчыкі дыямэнтаў, нездаволеныя гэтай падачкай, паладзілі ў Антвэрпэне вулічную дэманстрацыю. Яны патрабавалі павялічэньня дапамогі, неадкладнай выплаты першай дапамогі і падпачаленьня касы выключна кантролю саміх рабочых. Па масавы сход рабочых меншавікі прафсаюзаў загадзя выклікалі паліцыю і жандараў. Паліцыя пры першым выступленьні прадстаўніка рэвалюцыйнай апазіцыі накінулася на яго і на пратэставаўшых рабочых і гвалтам вывела іх са сходу.

Фашысты нападаюць на рабочыя сходы

НЬЮ-ЁРК, 27-XI. У Нью-Арлеане паліцыя ўчыніла наскок на памяшканьне рэвалюцыйнай „Лігі маракоў". Канфіскавана літаратура. Арыштавана 2 арганізатары Лігі. Нью-Арлеанская паліцыя арыштавала яшчэ двух арганізатараў рэвалюцыйнага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў.

Нью-арлеанскі мэр (гарадзкі галава) зьвярнуўся да мясцовай арганізацыі фашыстаў з просьбаю даць дапамогу ў прыдушэньні камуністычнага руху. Легіён фашыстаў абяцаў супрацоўнічаць з мясцовай уладаю.

У Сан-Бэрнардына (Каліфорнія) паліцыя разагнала мітынг, скліканы камуністычнай партыяй Злучаных Штатаў. Паліцыя арыштавала 7 удзельнікаў мітынгу.

Фашысцкія арганізацыі выконваюць ролю паліцыі.

ВЕНА, 28-21. Ва ўчарашнім пасяджэньні бюджэтнай камісіі парляманту сацыял-дэмакраты падалі занятаньне накопт усё больш шчыльнага ўрастаньня хэймвэру ў дзяржаўны апарат, асабліва ў Тыролі, дзе хэймвэр узброены па ваеннаму і процізаконна выкарыстоўваецца ўладаю ў якасьці міліцыі.

Міністр унутраных спраў Шымі заявіў, што арганізацыі самаабароны зьяўляюцца легальнымі, а неабходнасьць выкарыстаньня іх у якасьці міліцыі выклікана асаблівымі ўмовамі палітычнага становішча. Выступіўшы з дадатковаю заявою Шобэр перасьцерагаў сацыял-дэмакратаў, параіўшы ім не рабіць нажыму. Прыгразіўшы ім контр-нажымам, ён заклікаў ня чыніць перашкод пры правядзеньні праектаў і супрацоўнічаць з буржуазнымі партыямі ў справе ўціхаміраньня краіны.

Бюджэт імпэрыялістычных дзяржаў і Савецкага Саюз

Бюджэтны плян СССР на новы гаспадарчы 1929 30 г. выпрацаван ужо настолькі, што на сучасны сэсіі ЦВК ён будзе апошні раз разгледжан. У сувязі з гэтым было-б вельмі цікава і для працоўных мас вельмі карысна параўнаць гаспадарчую палітыку пралетарскай дзяржавы з гаспадарча-эканамічнай палітыкай буржуазных дзяржаў. Як пакажуць ніжэйпададзеныя даныя, дзяржаўны бюджэт зьяўляецца самым верным адбіткам у лічбах клясавай палітыкі краіны.

Бюджэтны плян Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў на 1928-29 г меў балянс з 3557 мілёнамі даляраў. 1312 мілёнаў даляраў з гэтай сумы, г. зн. 34,1 проц. усяго бюджэту было вызначана на аплату мытаў і дзяржаўных будынкаў. Для ваенна-марскога і ваеннага міністэрства прышлося 371,2 млн. і 392,5 млн.: разам 763,7 млн. даляраў, г. зн. 21,5 проц. бюджэту. Далей, так званая рэнта інвалідаў вайны дала суму прыблізна ў 400 млн. даляраў. Таму што дзяржаўная запазычанасьць Амэрыкі, галоўным чынам, абумовілася ваеннымі выдатк., дык можна сказаць, што $^2/_3$ (63-65 проц.) дзяржаўных сродкаў Злучаных Штатаў ідуць на пагашэньне мінулай вайны і да падрыхтоўкі будучай. Для міністэрства земляробства дасталося 4,1 проц., а для міністэрства працы цэлых... 0,3 проц. з усёй агульнай сумы!

Бюджэтны плян ангельскіх выдаткаў на 1929-30 гаспадарчы год выяўлен у суме 742 млн. фунтаў стэрлінгаў. З іх 305 фунтаў ідзе на пакрыцьцё дзяржаўнай запазычанасьці і 113 млн. фунтаў на абарону краіны. Такім чынам, непрадукцыйныя выдаткі складаюць 418 млн. фунтаў, або 56 процантаў агульнага бюджэту (прычым тут ня прыняты пад увагу выдаткі па ўтрыманьні інвалідаў вайны).

Праэкт францускага бюджэтнага пляну на 1930 год вытрыман у нязьменых францускіх традыцыях, якія ўжо даўно ўкараніліся; на народную гаспадарку асигнуецца толькі на 50 млн. франкаў больш, чымся ў 1929 годз

ПРАВЕРЫМ ДЗЕЙНАСЬЦЬ СУДОВЫХ ОРГАНАЎ.

Работу сельскіх судоў—на абгаварэньне мас.—Самакрытыкай і крытыкай зьнішчым валакіту і бюракратызм у рабоце судоў.

Намечанасьць калегіі абаронцаў

...газэце і быў допіс Фрыдма-...ьмі шчырым шанаваньні ад-...тарых часоў, але трэба зьвяр-...у на тое, што калегія не ...яшчэ ад антысавецкіх эле-...такіх адвакатаў, якія зьяў-...брані калегіі абаронцаў пры ...кім судзе, як Сідлярэўскі, ...Чысьцякоў, Сушчынскі, Нем-...гэта цэлая галерэя антыса-...дзей, якія падмазаліся да ...апарату, уцёрліся ў давер'е ...адказных работнікаў і ў ...аводзяць тое, што ім заду-...выніку гэтага назіраецца ...ладняка, заціраньне яго і ...е. Пра выхадцаў з рабочых ...ць, што „рабочы груб, ён ...ор і не яго справа судовая ...

...сучаснае. Цяпер выкрыем іх ...Пачнем папарадку. Сідля-...раней член Магілеўскага ак-...суду, пры польскай акупацыі ...Менскага акруговага суду. ...кі зьдзекваліся над чырво-...тызанамі, дык Сідлярэўскі ў ...раве займаў не апошняе ...

...н, спачатку 1921 году зьяў-...гай. Калі ён яшчэ працаваў ...у трыбунале, то казаў, што ...у служыць за 20 фунтаў ...не Няміга прынясе масла, ...і хлеба". І з таго часу „ён ...отаць толькі для спэкулян-...абандыстаў Нямігі. З рабочымі Цэйтлін і гаварыць ня хоча. Цяпер ён служыць, бо плацяць не 20 фунтаў, а 180 руб. Служыў у Дзянікіна. Ад парады рабочым ухіляецца і заўсёды стаіць на судзе за пэпманаў.

Чысьцякоў, пры старым рэжыме член Менскага акруговага суду. Судзіўся трыбуналам і інш. Выгналі яго з Наркамзема за цёмныя справы.

Сушчынскі—сын Заслаўскага папа. Яго бацька і сын члены „рускага народу". Бацька яго „выціскаў" рэвалюцыйны дух з выхаванцаў настаўніцкай школы, а сын даваў настаўленьні ў часе капікул, „што я вас усіх заганю ў турму". Яўныя ўдзельнікі і прыяцелі цёмных спраў Жыткевіча, былога вучня Ізяслаўскай школы, які органамі ВЧК быў пасаджаны ў канцэнтрацыйны лягер

Намкоўская—жонка спэкулянта, была заграніцай, займалася камэрцыяй, зьвярнулася ў 1925 годзе ў Расею і па пратэкцыі прынята ў члены калегіі толькі з тых меркаваньняў, што ў 1919 годзе была часова судзьдзёй. Уласьніца, аддае каменны дом у арэнду.

Балінскі—былы земскі начальнік, член „рускага народу", шкодны і антысавецкі элемэнт. Пры савецкай уладзе ня выявіў сябе, як савецкі працаўнік.

Ня гледзячы на тое, што ўся гэта галерэя за апошнія часы імкнецца заслужыць даверлівасьць работнікаў НКЮ, думаем, што ім ня месца ў савецкіх установах.

Рабкор.

Я ня трэба суду абараняць батрачку.

...пачалася 2 гады таму назад ...скім нарсудзе, калі батрач-...ла ў млынара, пазбаўленага ...правоў Дворына, які пахо-...Місьціж і прыжыла ад яго ...з-жа пасьля гэтага яна зваль-...работы. Батрачка падае за-...суд Бягомльскага раёну, каб ...зіл аліменты на утрыманьне ...арсуд здаваляе іск батрачкі, ...н гэтакім рашэньнем суду ...езадволены. Яму на дапамо-...обрыя грошы прыходзіць ...онца Рабіновіч, які пра-...орыну свае ўслугі і піша ...акрсуд касацыю. Менскі акр-...ючыся на некаторых «ака-...» пастанову Бягомльскага ...мняне і перадае справу на ...разгледжаньне нарсуду Пле-...а раёну. Справа вырашаецца ...ы бок, г. зн. у карысьць ба-...

...аронца Рабіновіч усё-ж такі ...н рашэньнямі 2-х судоў і піша касацыю ў акрсуд у другі раз, Акрсуд адмяняе пастанову Плешчаніцкага нарсуду і справу перадае ў трэці раз ужо нарсуду Барысаўскага раёну. Тут на дапамогу млынару Дворыну прышоў правабаронец Іоффе, які піша ў суд хадайніцтва аб адлажэньні справы з прычыны вяўкі 2-х сьведак з боку Дворына. Нарсуд Барысаўскага раёну бязумоўна здавальняе хадайніцтва абаронца Дворына і справа 2 разы адкладваецца.

Дайшло да таго, што бедная батрачка ходзячы 2 гады на судох, кідае дзіця ў памяшканьні Барысаўскага суду.

Вось як Менскі акруговы суд абараняе інтарэсы батрацтва, вось як нашы судовыя органы праводзяць у жыцьцё дырэктывы партыі. Нам яшчэ невядома як канчаткова вырашана гэтая справа Барысаўскім судом. Ёсьць досы ь падстаў, каб РСІ умяшалася ў гэтую справу.

М-коў.

Справе ня відаць канца.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

...ваньне работы акруговага су-...а факты самай зялдлай це-...якой вінаваты ня толькі ...суд, а і вышэйшы суд рэс-...утарка ідзе аб справе стрэ-...рышановіча, па якой вось ...гады ніяк судовыя органы ...вынесьці судовай пастановы.

...малюецца так. Звольнілі ...а Грышановіча з работы. За ...адміністрацыя, што ён ня ...да работы Прафсаюзныя ...е здаволіліся гэтай матывіроўкаю, апратэставалі яе, і з гэтага часу пашла справа хадзіць па судовым інстанцыям без канца і бяз меры. Звальненьне адбылося ў маі месяцы 1926 году і да гэтага часу судовай справе ня відаць канца.

З пачатку справа больш году хадзіла ад аднае да другое профсаюзнае ўстановы, потым перайшла для разбору ў судовым парадку ў Жлобінскі народны суд. Здавалася, што тут справа скончыцца, але кіраўніцтва Заходніх чыгунак у дзень суда зьмяняе прычыну звальненьня Грышановіча. Яно заяўляе, што апошні быў скарочан па скарачэньню штатаў. Суд справу адкладвае.

Прайшло некалькі месяцаў, а справа ляжыць бяз руху. Урэшце жлобінскі парсуд зноў разглядае яе і ня маючы ніякіх падстаў, выносіць рашэньне, што стрэлачнік Грышановіч звольнен правільна,

Вядома, стрэлачнік Грышановіч не застаўся здаволеным такой пастановаю. Акруговы суд не зьвярнуў ніякае ўвагі на скаргу Грышановіча.

Грышановіч пашоў шукаць праўды ў пракурора. Пракурор пашоў насустрач і апратаставаў рашэньне суда. Пасьля гэтага, справа яшчэ раз разглядалася ў акруговым судзе, але ня была вырашана і была перададзена на канчатковае вырашэньне ў Вышэйшы суд рэспублікі.

Гэта ўжо было ў студзені 1929 году, амаль што праз тры гады пасьля звальненьня Грышановіча з работы. Вярхоўны суд адмяняе справу і, замест таго, каб даць ёй канчатковае вырашэньне, пасылае ў Жлобінскі суд для разгляду.

Зноў пачалася валынка. Назначаецца суд,—не зьяўляецца адказчык, назначаецца другі раз—не зьяўляецца ісьцец. Справа прызначаецца ў трэці раз. Зноў на суд не зьявіўся адказчык нягледзячы на тое, што ён своечасова атрымаў позву ў суд. Здаецца, не зьяўленьне адказчыка пры атрыманьні позвы і такая зацягласьць судовае справы дае магчымасьць Жлобінскаму суду разгледзіць канчаткова гэту справу. Але ня тут-то было. Новы раз справа адкладваецца. Зноў пашла блытаніна, цяганіна без канца і меры. А стрэлачнік Грышановіч тым часам адхадзіў усе інстанцыі і ўстановы і нідзе ня можа знайсьці канца гэтай справе.

Д. Дамброўскі.

Абгаворым работу сельсудоў.

Пастановай ЦВК у мінулым годзе былі для в ныту арганізаваны па аднаму ў кожным раёне суды пры сельсаветах.

Задача гэтых судоў заключалася ў набліжэньні суда да насельніцтва, зрабіць разгляд дробных спраў спраннай самога насельніцтва і гэтым садзейнічаць разьвіцьцю ў насельніцтве крытычных і адмоўных адносін да розных шкодных зьяў быту, някультурнасьці і г. д.

Вынікі гадавой работы гэтых вопытных судоў сьведчаць аб значным аўтарытэце, які яны набылі ў насельніцтва і досыць вялікай зацікаўленасьці ў іх рабоце сялянства.

Абсалютная большасьць галасоў кажа за тое, што гэты вопыт удаўся і яго можна ўвесьці ў сыстэму, г. зн.— утварыць такія суды пры ўсіх сельсаветах.

Гэткае рашэньне мае вялікае практычнае значэньне ва ўмовах вёскі, чаму мы і выносім яго на шырокае абгаварэньне нашае грамадзкасьці.

Першае, што трэба ісьць на ўвазе, калі мы кажам аб арганізацыі сельсудоў, гэта тое, што, перадаючы ў іх частку спраў, якія разглядаюць зараз народныя суды, мы значна зьніжаем меры пакараньня. Напрыклад, за хуліганства (арт. 107 «а») нарсуд можа абвінавачваемым вызначаць 6 месяцаў Допру альбо 1 год прымусовых работ; па нашаму праэкту максымальнай мерай для сельсуду зьяўляецца 15 дзён прымусовых работ.

Адтэуль вынікае такое пытаньне: наколькі сельсуды павінны рабіць уплыў амаль выключна выхаваўчымі і грамадзкімі мерамі, то ці трэба ў іх судзіць усё насельніцтва данага сельсавету, альбо якую частку яго? Мы мяркуем, што сельсуд павінен разгляда ць справы толькі працоўнага насельніцтва; калі-ж хуліганства ці крадзеж зробіць які-небудзь кулак ці пазбаўленец, дык іх павінен судзіць народны суд, каб даць яму пакараньне поўнай мерай, вызначанай нашымі кодэксамі.

У парадку крытыкі існуючага закону аб сельскіх і тав арыскіх судох трэба сказаць, што ў ім трэба выкінуць правы сельсудоў разглядаць справу аб на зелах; праверка работы судоў у гэтым напрамку паказала, што тут яны не заўсёды вытрымліваюць клясавую лінію. Маючы правы на разгляд гэтых спраў, сельсуды аб'ектыўна будуць садзейнічаць далейшым разьвіцьцю і паліпшэньню Грышаноўшчыны, якая і дагэтуль наглядаецца, у галіне падрыхтоўкі кадраў і ў корані перабудаваць усю сыстэму сельска-гаспадарчай адукацыі, перанесьці ўвесь цэнтр цяжкасьці на абслугоўваньне калектыўнай гаспадаркі, а не індывідуальнай.

На-трэцяе, мабілізаваць усе сілы і сродкі для больш хуткага і пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтай задачы, што і палітычна, і эканамічна пекарысна. Вось чаму мы лічым, што ў новым законе трэба гэту катэгорыю зьяць.

Разам з тым, агляд работы сельсудоў паказаў, што яны ўжо зараз значна перавышаюць сваю кампэтэнцыю і разглядаюць справы, разгляд якіх ім законам не дазволен. І мы схіляемся, што гэтыя парушэньні выклікаюцца жыцьцём і нам трэба пашырыць іх правы. Такім чынам, мы прапануем дапоўніць правы сельсудоў, надаўшы ім шэраг новых відаў спраў.

Так, мы лічым мэтазгодным перадаць сельсудам дадаткова справы аб хуліганствах, аб лёгкіх пабоях, аб паклёпе, бойках. Па лініі грамадзянскай—даць ім правы разглядаць іскі на суду да 50 рублёў. Робячы гэтыя дадаткі, мы дамо сельсуду мажлівасьць ахапіць амаль поўнасьцю штодзённыя дробныя бытавыя спрэчкі насельніцтва.

Каб надаць сельсудам больш аўтарытэту, мы лічым зусім мэтазгодным зрабіць іх рашэньні канчатковымі без права іх касіраваньня. Адмена альбо перагляд павінны рабіцца, на нашай думцы, толькі нарсудзьдзёй, калі ён заўважыць у рашэньні сельсуду парушэньні.

Сельскія суды змогуць сябе апраўдаць толькі пры дастатковай увазе на іх работу з боку партыйных і грамадзкіх арганізацый, большага кіраваньня і інструктаваньня з боку народных судоў, пры умове забясьпечаньня іх у тэхнічных адносінах неабходнымі прыладамі

Пры перавыбарах трэба забясьпечыць іх лепшымі якоснымі і працаздольнымі асобамі, уцягнуўшы ў работу сельсудоў больш батракоў і беднякоў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў гэту работу жанчын.

Толькі тады задача, якая пастаўлена перад сельсудамі, будзе выканана і мы будзем мець у вёсцы яшчэ адзін фактар барацьбы з някультурнасьцю, п'янствам, хуліганствам, на абавязку якога будзе ляжаць папярэджваць сацыяльна шкодныя зьявішчы ў барацьбе за лепшы быт і культуру.

Лічачы гэта пытаньне надзвычайна важным, пажадана каб працаўнікі месц выказаліся на старонках друку аб мэтазгоднасьці ўвядзеньня сельскіх і мястачковых судоў, як сыстэмы па ўсёй Беларусі, гэтак і аб характары іх кампэтэнцыі.

Х. А.

ДАБ'ЁМ РЭЛІГІЙНЫ ДУРМАН

БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ СЯЛЯНСТВА ВЫНОСЯЦЬ ПАСТАНОВЫ АБ ПЕРАДАЧЫ ЦЭРКВАЎ ПАД КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ. — ПАПЫ АДМАЎЛЯЮЦЦА АД ВЫКАНАНЬНЯ РЭЛІГІЙНЫХ КУЛЬТАЎ.

Замест царквы сямігодка.

(*Уваравіцкі р., Гомельшчына*).

Пры Чабатовіцкім сельсавеце на сходзе беднаты ставілася пытаньне аб пабудове сямігодкі. Беднякі загаварылі аб тым, каб забраць царкву пад школу. Беднята **пастанавіла** даручыць партячэйцы КП(б)Б, тав. Еўменаву П., настаўніку А. Лашковічу і хатніку Л. Карпенка правесьці сход па ўсіх пасёлках і вёсках.

У выніку растлумачальнай працы ўсе сялене вёсак пастанавілі перадаць царкву пад школу сямігодку. Вёска Альхоўка таксама вынесла пастанову аб гэтым. Заможная частка в. Альхоўкі агітавала беднякоў супроць і нават адкрыта казалі сераднякам не галасаваць.

Сролінаў.

Папы кідаюць цэрквы.

Шырэй фронт антырэлігійнай прапаганды. Зьнішчым канчаткова рэлігійны дурман.

Буйны тэмп сацыялістычнага будаўніцтва, рашучы і пераможны наступ сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя выклікае глыбокія працэсы сярод нашых ворагаў унутры нашай краіны. Кулакі, нэпманы, клерыкалы розных масьцей усямерна імкнуцца адстаць свае пазіцыі, скарыстоўваючы ўсялякія формы і мэтады барацьбы як тэрор, утварэньне контрраволюцыйных арганізацый, прыстасаваньне да нашых савецкіх умоў для вядзеньня барацьбы больш тонкімі мэтадамі і г. д.

Аднак, пераможны наступ пралетарыяту і бяднацка-серадняцкага сялянства над кіраўніцтвам камуністычнай партыі на рэшткі капіталізму выклікае развал у лягеры варожых нам элемэнтаў. Гэта падцьвірджаецца фармальным развалам як каталіцкай, так і праваслаўнай царквы. Працоўныя масы капчаткова вызваляюцца ад рэлігійнага дурману. Нават ксяндзы і папы, якія цесьнткамі гадоў былі вернымі слугамі „найвышэйшага", кідаюць сваю „прафэсію". У нашых газэтах не асабліва даўно паведамлялася аб тым, што ксёндз Жамойтэк у Менскай акрузе, ксёндз Сук у Мазырскай і ксёндз Валынец у Гомельскай скінулі сутаны, заявіўшы, што рэлігія абман, што яны ня хочуць больш дурачыць працоўныя масы.

Мы сёньня падамо некалькі фактаў аб такім-жа «руху» сярод праваслаўных папоў. Вось што піша ў сваім лісьце былы поп Каўбчанскай царквы, Клічаўскага райёну, Бабруйскай акругі С. Валвудзкі: „Я на працягу 28 гадоў сеяў сярод насельніцтва рэлігійны дурман. Кастрычнікавая рэвалюцыя зьмяніла гэтае становішча. Частка сялянства, асабліва моладзь, пачала крытычна адносіцца да рэлігійнага культу. Гэта паслужыла стымулам для пераацэнкі таго, ва што я веру. Бяруся за навуку, аналізую перажытае мною і... вынікам усяго гэтага... мне стала соромна перад насельніцтвам і перад сабою за тое глупства, якое я прапаведваў.

Выступаючы сёньня перад савецкаю грамадзкасьцю, я поп з 30 гадовым стажам унэўчена заяўляю, што рэлігія абман, накіраваны на клясавае прыгнечаньне. Працоўныя, ня верце папом розных сэктаў і напрамкаў! Пакончце з гэтым абманам!"

А вось ліст другога папа, які піша ў рэдакцыю наступнае: „Я, Константин Ипполитович Николаевич, проживающий в с. Осовце, Любаньского района, Бобруйского округа и состоявший священником местной церкви, об'являю во всеобщее сведение, что снимаю с себя сан священника и желаю посвятить свои силы и способности общественному полезному труду".

К. И. Николаевич.

Трэці поп Гурыновіч Дзяніс, Касьцюковіцкага райёну, Магілеўскай Акругі прыслаў у рэдакцыю заяву наступнага зьместу: «Я уроженец из Польши, сын батрака у помещиков, с трудом удалось окончить учительскую семинарию и прослужил 24 года народным учителем. Будучи обременен семейством и не имея средств к жизни я в 1909 году поступаю в попы и назначаюсь в Печерскую церковь, где и служил до 17 ноября 1929 года. 17 ноября в виду религиозных разубеждений я публично в церкви отказался от поповства и желаю быть мирным гражданином. Живу я одиноким и имею от роду 69 лет».

Денис Гуринович.

А вось і чацьвёрты ліст, які прысланы ў рэдакцыю. „Я сын пана сяла Радамля, Чавускага райёну, Магілеўскай акругі Саханаў Віктар, убачыўшы заблуджэньне сваіх бацькоў адракаюся ад іх, спыняю з імі ўсялякія зносіны".

Віктар Саханаў.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што працэс распаду рэлігіі ідзе пасьпяхова, што рэлігійны дурман, які трымаў у палоне цэлыя стагодзьдзі працоўныя масы зьнікае. Аднак было-б зусім памылковым недаацэньваць барацьбы з рэшткамі рэлігіі. Наадварот, сучасны нэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе ад нас узмацненьня гэтай галіны працы. У саюз бязбожнікаў павінна быць уцягнута максымальная колькасьць працоўных. **Рэлігійны дурман трэба канчаткова дабіць.**

Царквы пад культурна-асьветныя ўстановы.

(*Мазыршчына*).

Вёска шпаркімі крокамі ідзе да новага жыцьця, шляхам калектывізацыі, разрыву з рэлігіяй, зачыненьня царквей і г. д.

Вёска Насавічы ўся калектызавалася і царкву перадала пад клюб. Яе прыкладу пасьледвалі вёскі: Даманавічы, Какцавічы, Сухавічы і г. д. Але гэты магутны наступ на дурман і цэмру ня ўсюды сустракае падтрыманьне. Так, Калінкавіцкі РВК і Мазырскі АВК згадзіліся на перадача ў двух царквей Насовіцкай і Даманавіцкай пад клюбы, хоць і цягнулася гэта справа доўга. Ужо месяц у Насавічах у былой царкве адбываюцца сходы, ёсьць радыё, арганізоўваюць гульні, а афіцыйнага дазволу на перадачу царквы няма.

З Сухавіцкай і Какцавіцкай царквамі яшчэ горш. Так, прыход Сухавіцкай царквы ў асобе папа і ўсяго царкоўнага савету адмовіліся ад гаспадараньня ў царкве. Зачыніўшы царкву яе ніхто з веруючых ня хоча браць ў сваё карыстаньне; просяць сельсавет, РВК і АВК прыняць ад іх царкву для культпатрэб насельніцтва. Ні сельсавет ні РВК не зрабілі гэтага.

Паехаў сэкратар РВК тав. Новікаў з паперамі ў АВК за парадай, а там яму сказалі літаральна наступнае: **„Хопіць з вашага райёну двух узятых царквей. Іх хоць культурна скарыстайце, а больш не чапайце".**

Не разумеюць сяляне. Замест таго, каб скарыстаць жаданьне сялян да культуры, каб дапамагчы вызваліцца сялянам ад рэлігійнага дурману, каб перадаць царквы пад культурныя установы, Мазырскі АВК станавіцца ў абарону папоў і царквей. Трэба прымусіць Мазырскі АВК выконаць хадайніцтва бяднацка-серадняцкага сялянства аб перадачы Сухавіцкай і Какцавіцкай царквей пад культурна-асьветныя установы.

В. А. Сяргейчык.

Бярыце прыклад.

(*Верасьніцкі с-с., Тураўскага р.*)

Некалькі тыдняў таму назад, як гр-не в. Малешоў пастанавілі аддаць царкву і капліцу пад культурныя ўстановы.

Цяпер сяляне в. Малешоў замест царквы маюць свой клюб, а заместа капліцы—каапэрацыйную краму. Арганізаваны ў в. Малешаў калгас з 35 гаспадарак.

Трэба сказаць, што сяляне ўсьвядомілі, што рэлігія непатрэбная справа, што яна шкодліва нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Астатнія вёскі Тураўскага раёну павінны пасьледаваць добраму прыкладу сялян в. Малешаў.

С. Ш.

Царкву аддаём пад школу.

(*Полаччына*).

Згарэў будынак Дворжыцкай сямігадовае школы. Агульны сход сялян Краснаборскага сельсавету, які адбыўся 17 лістапада ў вёсцы Дворжышча аднагалосна ўхваліў перадаць Дворжыцкую царкву пад сямігодку. Для зацьверджаньня гэтай пастановы сход узбудзіў хадайніцтва перад адпаведнымі органамі.

Я. Скарновіч.

Праблема кадраў і шляхі яе частковага вырашэньня.

Тэмп падрыхтоўкі новых кадраў нельга параўнаць з тэмпамі індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі. Мы стаім перад вялізарным рассоўваньнем „ножніц" паміж попытам на спэцыялістаў і сучаснымі тэмпамі іх росту. Гэта можа быць тормазам далейшага пасьпяховага разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі.

... Падрыхтоўка новых спэцыялістаў яшчэ не ператварылася ў важнейшую задачу ўсёй партыі. Харантэрыстыка, якая дадзена справе падрыхтоўкі спэцыялістаў на лінёўскім пленуме, у асноўным застаецца ў моцы і для сучаснага пэрыяду... ЦК прапануе ўсім партыйным, гаспадарчым і прафэсыянальным арганізацыям паставіць у цэнтры сваёй работы выкананьне гэтай важнейшай задачы, арганізуючы вакол гэтага актыўнасьць шырокіх пралетарскіх мас.

(З пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) ад 15-IX—1929 году).

...рост калгасаў ва ўсім Савец-...і ў БССР усё больш востра ...пытаньне з усёй рашучасьцю ...цьці самых неадкладных мер ...тоўкі і ўтварэньня патрэб-...асьці нам кадраў па сельскай ...ы, асабліва спэцыялістаў вы-...сярэдняй кваліфікацыі.

...ня зараз у БССР каля 120 ...алгасаў з 175.000 гэктараў ...тугоўваюцца 3-4 аграномамі, ...гавых аб'яднаньняў (кожны ...дае 4-5 калгасаў) маюць усяго ...аномаў. Шмат якія кусты ...маюць аграномаў. Гэткае аграна-...ньне нават не здавальняе ...ных правіл агранамічных на-...наў.

...калем вымушаны канстатаваць ...факт, што акруговыя саюзы ...якія зьяўляюцца фактычны-...кімі ўсім калгасным рухам ...нават і наш цэнтральны апа-...алгассаюзу ня мае яшчэ та-...лістаў, якія яму патрэбны ...шні дзень. Паміж іншым, ...якія канчаюць Беларускую ...аспадарчую Акадэмію, лічаць ...ыгодным прыстроіцца за ме-...Р.

...вядома, у даным выпад-...амічныя прычыны, якія за-...а ў тым, што аграномы ў ...раўнальна матар'яльна лепш ...аны, чымся аграномы ў БССР. ...даючы на тое, што Беларусь ...а адным з дамініруючых ра-...гадоўлі лёну нават у машта-...і абцяе шмат будучага ў ...беларускай тэкстыльнай ...асьці (паасобныя раёны, ...д, Дрысенскі, Полацкай акругі, пераходзіць на суцэльную калектывізацыю с.-г. з ухілам па гадоўлі лёну). Тым ня менш ніводны з паказаных раёнаў і округ не забясьпечаны ніводным спэцыялістам па гадоўлі лёну, нават у цэнтральным апараце Белкалгассаюзу на сёньнешні дзень няма спэцыяліста-працаўніка па лёнагадоўлі.

Выгворчае абсьледваньне Белкалгассаюзам цэлага шэрагу раёнаў, округ і калгасаў сьведчыць аб тым, што пытаньне аб забясьпечаньні нас кадрамі зьяўляецца пытаньнем першачарговай важнасьці, бяз поўнага і неадкладнага вырашэньня якога немагчыма ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну калектывізацыі сельскае гаспадаркі, а значыцца і перабудовы ўсёй нашай народнай гаспадаркі. У нас ёсьць цэлы шэраг выпадкаў, калі адсутнічаньне агранэрсаналу спрыяе разбурэньню некаторых калгасаў.

Няма чаго казаць, якую вялізарную шкоду нашай сацыялістычнай перабудове вёскі прыносіць распад калгасаў, асабліва гэта зьяўляецца перавагай у руках нашага клясавага ворага—кулацтва, які бяз таго „ціхай сапай" усяляк прымае меры да штучнага затрыманьня калгаснага руху.

Усім добра вядома, што цэлыя раёны пераходзяць зараз на суцэльную калектывізацыю. Адным з такіх раёнаў—Клімавіцкі, які ўжо перайшоў на суцэльную калектывізацыю. Апошні мае 102 тыс. гэктараў калектывізаванай плошчы, а абслугоўваецца 3-4 аграномамі, у той час, калі мінімальная патрэба—30-40.

Праблема кадраў патрабуе бязумоўнага сур'ёзнага вывучэньня, а галоўнае, неадкладнага вырашэньня. Цэлы шэраг мерапрыемстваў пры ўважлівых і сур'ёзных адносінах з боку аднаведных органаў здолеюць значна зьмяніць усю тую вострасьць, якую мы маем у гэтым пытаньні пры ўмове іх безадкладнага правядзеньня. Сюды належаць такія мерапрыемствы, як перакідваньне спэцыялістаў з іншых арганізацый у сыстэму калгасаў і рацыянальнае іх выкарыстоўваньне наогул.

Разьлічваць толькі на нашу беларускую падрыхтоўку кадраў мы ні ў якім разе ня можам. Прапускная здольнасьць Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, якая зьяўляецца асноўнай базай і забясьпечвае нас спэцыялістамі вышэйшай кваліфікацыі, вельмі нязначна і ў лепшым выпадку яна здолее даць 40-50 чалавек.

Да і пакуль выпуск Горацкай С-Г Акадэміі ня вельмі пажаданы калгаснай сыстэме, бо, як усім вядома, Акадэмія рыхтуе і працягвае рыхтаваць кадры па абслугоўваньні індывідуальнай гаспадаркі, а не сацыялістычнага сэктару. Адзіны факультэт, арганізаваны нядаўна па калгаснаму земляробству, ад якога можна адчуваць вынікі толькі праз 3—4 гады, а то і больш, але больш верна к канцу нашай пяцігодкі.

Мінімальная патрэба ў кадрах на адзін толькі наступны 1929-30 г. дасьць лічбу ў 2.275 чалавек, з якіх 341 аграномаў рознай спэцыяльнасьці вышэйшай кваліфікацыі, 578—сярэдняй і 1.356—ніжэйшай кваліфікацыі. Треба адзначыць, што пададзеныя даныя не аднавядаюць бурнаму тэмпу калектывізацыі і колькасьці калгасаў на сёньнешні дзень. Сюды ня ўключаны раёны суцэльнай калектывізацыі, як Клімавіцкі і інш. У адным толькі Клімавіцкім раёне будзе 30.000 рабочых рук, а гэты раён мае ўсяго 3-4 аграномы.

Наш 10-ці гадовы кадравы плян па адной толькі сыстэме Белкалгассаюзу выяўляецца ў лічбе 47.216 спэцыялістаў; вышэйшай, сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі і ўлічваючы сучасны вельмі павольны тэмп Наркамасьветы па падрыхтоўцы кадраў няма чаго казаць пры існуючай сыстэме і наяўнай сетцы ВНУ аб яго задаваленьні, не гаворачы ўжо аб тым, што поўны ахоп БССР калгасамі ўжо запраэктаваны для ажыцьцяўленьня ў працягу бліжэйшых гадоў. Значыцца, 10-ці гадовы кадравы плян павінен скараціць таксама і свае тэрміны і быць зьвязан у суровай адпаведнасьці з плянам калектывізацыі. Наколькі пытаньне аб кадрах недастаткова прадумана і ўрэгулявана відаць з таго, што нават такое пытаньне як кантрактацыя студэнтаў нікім дагэтуль канкрэтна ня вырашана і зусім ясна, што з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва ў гэтай справе кантрактацыя праходзіць самацёкам.

Некаторыя гаспадарнікі праводзяць гэта ў парадку спаборніцтва, падмяняючы і скажаючы спраўднае сацыялістычнае спаборніцтва. І на вопыту кантрактацыі студэнтаў С-Г Акадэміі высунуты лёзунг „хто больш". Зразумела, што за такое кіраўніцтва трэба сурова караць і зьжыць такую ненармальнасьць.

Які-ж лёгічны вывад трэба зрабіць з усяго паказанага?

Па-першае, у адпаведнасьці з апошняй пастановай Пленуму ЦК УсеКП пытаньню аб кадрах надаць ударны характар.

Па-другое, рашуча выкарчаваць прышчэпаўшчыну, якая і дагэтуль наглядаецца, у галіне падрыхтоўкі кадраў і ў корані перабудаваць усю сыстэму сельска-гаспадарчай адукацыі, перанесьці ўвесь цэнтр цяжкасьці на абслугоўваньне калектыўнай гаспадаркі, а не індывідуальнай.

Па-трэцяе, мабілізаваць усе сілы і сродкі для больш хуткага і пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтай задачы. Да гэтага належыць таксама і мабілізацыя рабочых, якіх трэба накіраваць у калгасы для ўзмацненьня пралетарскага ўплыву ў апошніх.

І, нарэшце, чацьвертае, узмацніць і ўмацаваць працу вучоты і разьмеркаваньня ў калгаснай сыстэме, дапамагаючы ім усялякім чынам у падшуканьні і рацыянальным разьмеркаваньні кадраў.

Канкрэтна, у нашых умовах мы высоўваем наступныя практычныя мерапрыемствы, якія незалежна ад мізэрнасьці нашых сродкаў павінны быць праведзены зараз-жа:

Значна ўзмацніць існуючую сетку с.-г. адукацыі, зьвярнуўшы галоўную ўвагу на факультэт калектыўнага земляробства, Каніцкага Тэхнікуму калектыўнага земляробства і г. д.

У 1929-30 годзе адчыніць 2 новых факультэты пры Акадэміі, адзін выключна па жывёлагадоўлі, а другі—па рольніцтву і яшчэ 2 тэхнікумы калектыўнай гаспадаркі і 1 спэцыяльна-трактарны тэхнікум, а для падрыхтоўкі ніжэйшага пэрсаналу адчыніць трактарную школу.

Павялічыць прыём на пералічаныя факультэты і тэхнікумы ў параўнаньні з бягучым годам у два разы.

Павялічыць прапускную здольнасьць Горацкай С.-Г. Акадэміі, Вэтінстытуту, тэхнікумаў і прафшкол з такім разьлікам, каб да вясны 1930 году была задаволена калгасная сыстэма, спэцыялістамі на 80 проц.

Правесьці датэрміновы выпуск Акадэміі і с-г тэхнікумаў.

Значна скараціць тэрмін навучаньня і зжыць засіджваньне студэнтаў на вучобе.

Наркамасьветы разам з зацікаўленымі ўстановамі прапрацаваць пытаньне аб тыпу спэцыяліста, які патрэбен калектыўнай гаспадарцы.

З прычыны таго, што вялічэзная патрэба ў кадрах ня можа быць задаволена існуючай сыстэмай і сеткаю працяжных с-г ВНУ, неабходна разгарнуць шырокую сетку стала існуючых разнага роду курсаў пры Акадэміі і Тэхнікумах для падрыхтоўкі кіраўнікоў буйных калгасаў і куставых аб'яднаньняў з прапускной здольнасьцю штогод ня менш 200 чал.; тэрмін навучаньня ад 1 году да 2 год.

Для падрыхтоўкі кадраў практычных вопытных працаўнікоў утварыць спэцыяльны практычны інстытут, асабліва ў райёнах суцэльнай калектывізацыі.

Для падрыхтоўкі масавых кадраў актывістаў, кіраўнікоў калгасаў і паасобных іх частак трактарыстаў, мацёраў, масларобаў, сыравараў, рахункаводаў і масавых культ-бытавых працаўнікоў разгарнуць шырокую сетку каротка-тэрміновых курсаў з тэрмінам навучаньня ад 2 да 3 месяцаў, арганізаваўшы іх пераважна пры буйных калгасах, прапусьціўшы праз іх ня менш 2.000 членаў калгасаў, а для іх абслугоўваньня арганізаваць з добра падрыхтаваных агранамічных працаўнікоў групу выкладчыкаў. (Некаторыя з пералічаных курсаў ужо арганізоўваюцца).

Для папулярызацыі і ўкараненьня агранамічных ведаў сярод калгаснікаў прапусьціць праз існуючыя райённыя агракурсы ня менш 3000 калгаснікаў.

У бягучым годзе перакінуць на працу ў калгасы спэцыялістаў сельскай гаспадаркі беспрацоўных, працуючых у кіруючых апаратах, а таксама і працуючых не па сваёй спэцыяльнасьці.

Разгортваньне новых агранамічных і вэтэрынарных пунктаў правесьці ў першую чаргу пры калгасах. У адносінах існуючых агра і вэтпунктаў усюды, дзе гэта магчыма і мэтазгодна ажыцьцёвіць пераход на тэрыторыю калгасаў.

Да 1930 году ажыцьцёвіць праграму завочнага навучаньня для падвышэньня кваліфікацыі спэцыялістаў і аграпамічнай пісьменнасьці членаў калгасаў.

У 1930-31 годзе ліквідаваць няпісьменнасьць сярод усіх калгаснікаў да 45 гадовага ўзросту, пабудаваўшы праграму навучаньня на паведамленьне вучням вестак у галіне неабходнай ім агракультурнай пісьменнасьці.

У далейшым, як правіла, ліквідаваць няпісьменнасьць сярод калгаснікаў у працягу аднаго году пасьля арганізацыі калгасаў.

Аханіць першапачатковым навучаньнем дзяцей 8 гадовага ўзросту членаў калгасаў.

У гэтым годзе камандыраваць 15 акадэмічных працаўнікоў і спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы заграніцу і

новыя навучальныя ўстановы, як правіла, арганізоўваць на тэрыторыі буйных агра-калгас-камбінатаў.

Усе пералічаныя мерапрыемствы павінны быць праведзены ў самым сьпешным парадку і толькі ў гэтым выпадку можа быць значна паменшаны крызіс у кадрах, які так моцна адчуваецца ў нас.

Побач з зазначанымі мерапрыемствамі трэба дакладна прапрацаваць пытаньне і зразумела вырашыць аб кэнтрактацыі студэнтаў. У парадку практычнага мерапрыемства прапануем заснаваць спэцыяльную міжведамственную арганізацыю (савет), якой і даручыць кіраўніцтва справы кантрактацыі.

Тэрмінова перабудаваць усю працу шэфаў у вёсцы і зьмяніць мэтады працы, зьвярнуўшы галоўным чынам увагу на максымальнае абслугоўваньне калгасаў аградапамогай.

Цэнтральнаму бюро аграсэкцыі практыкаваць прыняцьце шэфства аграномамі і іншымі спэцыялістамі над калгасам, наладзіўшы

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Трэба раскачацца.

Кампанія аб перавыбарах рэдкалегій насьценгазэт зьяўляецца адной з важнейшых кампаній у галіне культурна-масавай працы партыйных і камсамольскіх ячэек. Яна павінна адбіць наколькі выконваюцца дырэктывы партыі ў галіне мясцовага друку, кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і г. д.

Кіруючую ролю ў перавыбарах рэдкалегій, бязумоўна, павінны ў першую чаргу ўзяць на сябе партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Шырокі масавы агляд насьценгазэт мэтадам самакрытыкі, палепшаньне іх якасьці, аднаўленьне рэдкалегій і арганізацыя рабселькораў—вось галоўныя пытаньні, якія патрабуюць належнай ўвагі з боку ячэек у перавыбарах.

Гэта галіна працы ў шмат якіх мясцох пастаўлена дрэнна. Партыйныя дырэктывы па гэтаму пытаньню ячэйкамі ня выконваюцца. Яшчэ 4 Усесаюзная Нарада рабселькораў у сваёй рэзалюцыі па пытаньні кіраўніцтва рабселькораўскім рухам адзначала, што „на лініі партарганізацыі асноўнымі недахопамі кіраўніцтва, якія перашкаджаюць руху, зьяўляюцца:

а) недаацэнка ролі насьценгазэты як праваднікa партыйнага ўплыву на масы і спосабу выяўленьня сапраўдных настрояў рабочых; партячэйкі яшчэ не падыходзяць да насьценгазэт, як да сапраўднага зьвяна партыйнай і масавай работы на прадпрыёмстве;

б) усё яшчэ недастатковая ўсьведамлёнасьць нізавых партыйных арганізацый аб прынцыпах рабселькораўскага руху і з прычыны гэтага налёўнасьць у кіраўніцтве адміністраваньня, дзёрганьня і драбязьлівай апекі;

в) недастатковая дапамога рабселькораўскім арганізацыям у барацьбе за забясьпечаньне канкрэтных вынікаў па матар'ялах рабселькораў;

г) ня досыць энэргічная абарона рабселькораў ад прасьледваньняў (у паасобных выпадках нават заступніцтва за вінаватых)"...

Недахопы зазначаныя ў рэзалюцыі ў нас дзе-нідзе яшчэ ня выпраўлены. Больш таго, той матар'ял, які мы зараз у зьвязку з кампаніяй адтрымоўваем ад нашых рабселькораў, сьведчыць аб заняпадзе кіраўніцтва гэтай працай.

Досыць спаслацца на апошнія заметкі рабселькораў, якія зьмяшчаюцца ў нашых газэтах—не гаворачы ўжо аб тых, якія адасланы на расьследваньне — каб упэўніцца, што гэта праца на мясцох пастаўлена дрэнна.

Насьценгазэты ў шмат якіх мясцох губляюць свой масавы характар у той казённай вопратцы, якую ім часамі надаюць. Газэтай кіруюць 2-3 асобы «у парадку грамадзкай нагрузкі»—яе рэдкалегія, а парт'ячэйка і ўся маса стаяць у баку. Такія «газэты» звычайна зьяўляюцца ў сьвет толькі ў часе кампаніі і зьмест іх—агульныя разважаньні «над высокай матэрыяй».

Мясцовае жыцьцё, усе яго працэсы газэтай не закранаюцца. Вядома, што ў выніку такога „кіраўніцтва" яна робіцца простым шматком паперы, маса ёю ня цікавіцца. Больш таго, пры адсутнасьці кіраўніцтва ў газэту часамі трапяць варожыя і шкодныя нам думкі, якія выкладаюцца клясавым ворагам, асабліва на вёсцы.

Аб тэй ролі, якую павінна адыгрываць насьценгазэта, у свой час пісалася шмат; досыць напомніць, што яна павінна зьвяцца тым асяродкам вакол якога канцэнтруецца ўся грамадзкая думка таго ці іншага прадпрыемства, тэй ці іншай вёскі.

Паляшук.

Вайскораўская праца заняпала.

Праца сярод вайскораў №-га палка зусім адсутнічае. Вайскор-арганізатар вельмі перагружан працай, а дапамогі з боку партарганізацыі няма. Наводнае парады і нізкіх заняткаў сярод вайскораўскага гуртку не праводзіцца. Праца заняпала.

Шматтыражка таксама з лягернага часу ня выходзіць. Яшчэ ў чэрвені месяцы адбылася нарада вайскораў разам з рабкорамі—шэфамі маскоўска-курскай чыгункі, на якой пастанавілі выпускаць шматтыражку 2-3 разы ў месяц, ільлічоўкі—штодня і наладзіць сувязь з рабкорамі пасылкай газэт ім, а яны нам і пісаць карэспандэнцыі ў іх газэты, а яны ў нашы, але ўсё гэта засталося толькі на паперы. Шматтыражка ня выходзіць, а ільлічоўка выходзіць 1-2 разы ў месяц, і сувязі з рабкорамі ніякае няма.

Хутка зіма і ўжо пара распачаць сталую працу, вызначыць адзін дзень дзеля вайскораўскай працы, аднак гэтага нічога няма. Шмат ёсьць селькораў і рабкораў сярод папаўненьня, з якімі толькі трэба адно-два заняткі правесьці і яны знойдуць аб чым пісаць. Партарганізацыя павінна за гэту справу ўзяцца зараз-жа.

К.

Гутарак шмат, а справы няма.

У № арт-палку ёсьць шмат гутарак наконт вайскораўскай працы, але на справе нічага ня робіцца. Шматтыражка і ільлічоўкі выходзяць ненармальна, заўсёды з вялікім спазьненьнем; у палку ніякай вайскораўскай арганізацыі няма ніякага вучоту не вядзецца. Пастановы VI вайскораўскай нарады не прапрацаваны і не праводзяцца ў жыцьцё.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі гэтым пытаньнем зусім ня цікавяцца. Між іншым у палку ёсьць шмат актыўных ваенкораў, якія цікавяцца вайскораўскай працай, але ня ведаюць з чаго пачынаць, бо ні адкуль не атрымліваюць дапамогі ў сваёй працы. У бліжэйшы час, каму належыць, прыдзецца ўзяцца за ажыцьцяўленьне працы сярод вайскораўскага актыву.

Вайскор С.

Рабселькоры нам пішуць: вось дык „дзеяч".

Грамадзянін вёскі Былы-Мох Мсьціслаўскага раёну, Магілеўскае акругі Матузаў П. па сабраныя грошы, на пабудову пажарнай пуні—будуе сабе, са згоды старшыні Пацолтаўскага сельсавету Ка банава, вялікую хату. Пуня будуецца ужо другі год, ды ніяк не пабудуецца. Грамадзянін Матузоў ў 1922 годзе сабраў 200 пудоў жыта, нібы на земляупарадкаваньне і прысвоіў іх сабе. І вось выходзіць, што на грамадзкія сродкі пад „благаславеньне" старшыні сельсавету будуецца прыватная хата?

Язь—Вэ.

„НЯДЗЕЛЬНІК"—НА ПАБУДОВУ КЛЮБУ.

У мястэчку Кройску, Плешчаніцкага райёну РВК будуе нардом і клюб. На дапамогу яму сяляне з ваколічных вёсак зрабілі нядзельнік і прывязьлі на месца пабудовы бярвеньне.

Камар.

Наша парада рабселькорам.

За апошні час нашы рабселькоры асабліва маладыя закідаюць рэдакцыю спэцыяльнымі лістамі. У гэтых лістох таварышы зварочваюцца за парадамі выключна па селькораўскіх пытаньнях—як і аб чым пісаць і г. д. Бязумоўна, што нашы адказы ў пісьмовай форме пачынаючага пісаць здаволіць ня могуць і праз дзень у яго паўстае шэраг новых пытаньняў. Гэта прымушае нас яшчэ раз параіць нашым рабселькорам здабыць сабе па гэтых пытаньнях адпаведную літаратуру. Лепшым матар'ялам для нашых рабселькораў, у выглядзе падручніка, мы раім здабыць часопісь „Селькор", выданьне маскоўскай сялянскай газэты.

Часопісь „Селькор" зьяўляецца кіруючым матар'ялам для нашых рабселькораў, у якім можна знайсьці любы адказ на практычнаму пытаньню.

Апроч таго, здабыўшы часопісь пры яе дапамозе можна лёгка навучыцца таму, аб чым нам часта пішуць—гэта „аб чым і як пісаць у газэту"...

Часопісь ня толькі асьвятляе розныя пытаньні, яна дае для падпішчыка на сваіх старонках «завочныя карэспандэнцкія курсы».

Гэту часопісь мы раім ня толькі нашым рабселькорам, вайскорам і юнкорам, яе павінны здабыць кожная рэдкалегія, кожная партыйная і камсамольская ячэйка.

Каштуе часопісь „Селькор" ня дорага: на год—2 р. 80 к., на 6 м-цаў—1 р. 45 к. на 3 м-цы—75 кап. і кошт паасобнага нумару—15 кап.

Калі нельга здабыць на месцы, можна выпісаць на адрасу: Масква, 7, Вздвіжанка 7, Выдавецтва «Крестьянская Газета».

Мы спадзяемся, што нашы рабкоры гэту часопісь здабудуць.

Я. П.

Няма кіраўніцтва---няма і працы

У Сьмілавіцкім раёне маецца 56 насьценгазэт, але праца з рэдкалегіямі і наогул рабселькорамі ідзе марудна. Партыйныя ячэйкі не дапамагаюць у рабоце вясковых рэдкалегій і не даюць ім ніякага кіраўніцтва. Допісы, якія зьмяшчаліся ў насьценгазэце, сэкцыямі РСІ пры сельсаветах не расьсьледваліся, ніхто на іх не зьвяртаў увагі (Рудзенскі сельсавет).

Настаўніцтва ня прымае ніякага ўдзелу ў насьценгазэтах. Настаўніца Дагілеўская, будучы сябром вясковай рэдкалегіі, заўсёды адмаўляецца працаваць у газэце.

У газэтах не адбіваецца тая клясавая барацьба, якая маецца ў вёсцы.

Праца рэдкалегій вёсак Раўнапольле, Вестраў і іншых зусім запяпала.

У рэдкалегіі насьценгазэты Рудзенскага с-савету ёсьць антысэміт М. У гэтай-жа рэдкалегіі настаўнік Шыдлоўскі мала зьвяртае ўвагі на яе працу. Насьценгазэта ўжо доўгі час ня выходзіць. Культурныя сілы раёну стаяць у баку насьценгазэт. Вылучаныя ячэйкамі КП(б)Б таварышы не відуць ніякай працы сярод селькораў свайго с-савету.

У вёсцы Лешніца хуліганы зьбілі сябра рэдкалегіі, аб чым ведала і міліцыя, але нічога не зрабіла, хуліган яшчэ і зараз арудуе. Хуліган Каўзель А. з вёскі Зазор'е прыходзіць у Слабаду да селькора і пытаецца, дзе жыве селькор, які пісаў пра яго ў газэце (ён нават ведае, хто пра яго пісаў). Гэты хуліган пагражаў адпомсьціць за пісаньне ў газэце.

Сьцепкоры баяцца пісаць допісы аб дрэнных працаўніках, бо ведаюць, што з гэтага нічога не выйдзе.

Працу насьценгазэты трэба як мага хутчэй наладзіць, трэба, каб рэдкалегіі наблізілі іх да працоўных мас.

Куніца.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

на 30-ае лістапада 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	5.02	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	129.50	131.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.55	101.95
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.77	25.87
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.05	—
Дзяржг. паз. узм. сял. гас.	10.45	10.80
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.25	25.35
2 „ „ „ проц.	25.68	25.78
2 „ „ „ 6-проц.	25.68	25.78
12 проц. дз. паз. 1928 г.	102.79	102,84
11 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105.96	—

Спагнаць страхавыя плацяжы да новага году.

Плацяжы па абавязковаму акладному страхаваньню маёмасьці сельск. і гарадзкога насельніцтва ў БССР займаюць не апошняе мейсца ў фінансава-крэдытнай сыстэме дзяржавы, а з другога боку, абавязковае акладнае страхаваньне належачай насельніцтву маёмасьці (будынкі, жывёла і пасевы), асабліва ў бягучым 1929-30 годзе ў значнай меры забясьпечвае гэтую маёмасьць ад розных стыхійных бядот (пажары, падзеж жывёлы, градабіцьце, вымачкі і вымаразкі). Адгэтуль зразумела, якую важную ролю адыгрывае своечасовы збор страхавых плацяжоў.

За 1929-30 год органамі Дзяржстраху налічана плацяжоў па сельскаму акладному страхаваньню (за выключэньнем ільготнага фонду) 6.738.180 руб., а разам з нядоімкай за мінулыя гады 7.109.029 руб. і па гарадзкому 227.355 руб., а разам з нядоімкай 234.668 руб. Усяго па сельскаму і гарадзкому акладному страхаваньню налічана плацяжоў разам з нядоімкай 7.343.597 р. Лічба даволі значная.

Згодна пастановы ўраду БССР для ўзносу плацяжоў па сельскаму акладному страхаваньню ў 1929-30 годзе ўстаноўлены два тэрміны: першы з іх адпавядае другому тэрміну для ўзносу сельска-гаспадарчага падатку, а другі—трэцяму тэрміну па с.-г. падатку. Устаноўленыя Акруговымі Выканаўчымі Камітэтамі льготныя тэрміны для ўзносу першых 50 проц. страхавых плацяжоў па розным акругам і раёнам скончыліся ў канцы кастрычніка і пачатку лістапада. Страхавыя плацяжы, налічаныя з гаспадарак, якія абкладзены с.-г. падаткам у індывідуальным парадку, павінны былі паступіць у касу Дзяржстраху поўнасьцю да 25 кастрычніка. Улічваючы гэта, трэба было-б каб, прыкладна, да 5 лістапада паступіла страхавых плацяжоў з сельскага і гарадзкога насельніцтва ня менш як 60 проц. налічэньня.

Між тым, па інфармацыйных вестках Акруговых Страхавых Агэнцтваў, мы бачым, што на 15 лістапада г. г. паступіла па БССР акладных страхавых плацяжоў (разам з нядоімкай) усяго 3.769.880 рублёў, гэта значыць 51,3 проц. налічэньня. Самымі адсталымі акругамі зьяўляюцца: Полацкая, па якой паступіла ўсяго 48,9 пр. страхавых плацяжаў і Віцебская — 46,4 процантоў. Відавочна, што такое становішча са зборам страхавых плацяжоў нельга лічыць здавальняючым. Да ўстаноўленых Акруговымі Выканаўчымі Камітэтамі апошніх тэрмінаў узносу страхавых плацяжоў засталося якіх-небудзь два-тры тыдні і за гэты час, каб выканаць поўнасьцю заданьне, трэба спагнаць страхоўкі з насельніцтва 3.573.817 рублёў. Лічба не малая.

Трэба, каб сельсаветы, райвыканкомы і страхавыя агэнцтвы на мейсцах прынялі самыя рашучыя крокі да поўнага спагнаньня да вызначанаму тэрміну страхавых плацяжоў. Асабліва трэба зьвярнуць увагу на спагнанне нядоімкі за мінулыя гады і недапаступіўшых плацяжоў да першага ільготнага тэрміну. Да такіх няплатнікаў павінны быць ужыты зараз-жа меры прымусовага спагнаньня, а злосныя няплатнікі з заможнага сялянства павінны быць прыцягнуты да судовае адказнасьці.

Не пазьней, як да 31 сьнежня г. г. плацяжы, як па сельскаму, так і па гарадзкому акладному страхаваньню павінны быць спагнаны.

Чарнушэвіч.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Беларускай Акадэміі Навук.

УДЗЕЛ БССР У ВЫСТАЎЦЫ ДРУКУ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЙ.

Выставачны Камітэт выстаўкі друку нацыянальнасьцяй усяго сьвету ў г. Баку зьвярнуўся да БАН прыняць удзел у гэтай выстаўцы.

Прэзыдыум БАН зьвярнуўся з просьбай да Наркамасьветы ўзяць на сябе арганізацыю пасылкі на выстаўку патрэбных экспанатаў.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ВАДЫ БАБРУЙСКАГА ВАДАПРАВОДУ.

У нашай газэце пісалася ўжо аб тым, што пры правядзеньні вадаправоду ў Бабруйску—вада аказалася моцна-салёнай якую мажліва выкарыстаць на лекавыя мэты.

На Прэзыдыуме БАН быў заслуханы па гэтаму пытаньню даклад. Для далейшых досьледаў шчыліны і хімічных якасьцяў вады накіроўваюцца ў Бабруйск два супрацоўнікі Геолёгічнага Інстытуту.

У гэтых досьледах таксама прыме ўдзел супрацоўнік Інстытуту Санітары і Гігіены д-р Астапеня.

КНІЖНЫЯ ФОНДЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІАТЭКІ.

У сучасны момант БДБ налічвае ў сваіх кнігасховах да 500000 томаў. У час пераходу ў новае памяшканьне Бібліятэка будзе мець да 600000, а ў канцы пяцігодкі—да 1-го мільёну томаў.

Будаўніцтва новага памяшканьня БДБ мае быць скончана да лістапада 1930 г.

Зьвярнуць увагу на якасьць у хлебазагатоўках.

Павялічаны гадавы плян хлебазагатовак да 21 лістапада па БССР выкананы на 93,3 проц.

Першае месца ў галіне хлебазагатовак займае Віцебская акруга, якая выканала свой павялічаны плян ужо на 135,3 проц. Выканала на 102,1 проц. свой плян і Аршанская акруга. Набліжаюцца да выкананьня Магілеўшчына, якая выканала павялічаны гадавы плян на 93,7 проц., Меншчына—на 91,3 проц., Гомельшчына—на 90,3 проц., Полаччына—на 88,5 проц. Плятуцца ў хвасьце Мазыршчына, якая выканала гадавы плян 85,9 проц., і Бабруйшчына—на 85,2 проц.

Калі ў галіне выкананьня хлебазагатоўчых плянаў мы маем посьпехі і кампанія падыходзіць к канцу, дык зусім нездавальняюча стаіць справа з якасьцю загатовак. Так, удзельная вага ўсіх загатоўленых хлебных культур складае толькі 47,3 проц., а таму перад нашымі загатоўчымі арганізацыямі стаіць галавая задача зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на тое, каб загатовіць да канца кампаніі максымальную колькасьць хлебных культур. Тут павінна быць зьвернута асабліва ўвага на тое, каб кулацкія гаспадаркі ў выкананьне сваіх цьвёрдых заданьняў здавалі хлеб і пшаніцу, а не авёс і іншыя малакаштоўныя культуры.

Чарговы тыраж пазыкі ўзмац. сял. гасп.—ў БССР.

У студзені месяцы адбудзецца чарговы —5-ы тыраж выйгрышаў пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі па 48, 39 і 11 сэріях.

Наркамфін БССР мяркуе правесьці тыраж у адным з райёнаў Аршанскай акругі. Месца тыражу павінна быць вызначана Аршанскім акрвыканкомам.

Чарговы тыраж пазыкі 1926 году.

1-га сьнежня ў Маскве адбудзецца чарговы тыраж бяспроцантнай пазыкі 1926 году. Сярод буйных выйгрышаў будуць разыграны 1 у 100.000 руб., 2—па 50.000 руб., 3—па 25.000 руб., 5—па 10.000 руб. і 10—па 5.000 руб.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

30-XI даклад т. Мазура аб падручніках для сямігодовых школ. Пачатак а 8 гадз.

1-XII Беларускім дзяржаўным тэатрам пад кіраўн. Галубка ставіцца п'еса „Правакатар" у 5-ці актах і 6-ці абразох (пераклад з польскага Бусла). Білеты ад 12—2 гадз. і ад 6 да 10 гадзін.

— Сёньня 30-XI г. г. а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход усіх падпрацаўнікоў разам з асьветнікамі г. Менску.

На абвестцы дню—даклад т. Мазура аб падручніках для масавых школ.

30-X, 1-XII і 2-XII г. г. у памяшканьні ЦП саюзу Працасьветы з 2-х да 4-х гадз. дня будзе праходзіць перарэгістрацыя пайнікаў МЦРК — беспрацоўных сяброў саюзу Працасьветы.

Не прайшоўшыя перарэгістрацыі ня будуць унесены ў сьпіс на атрыманьне талёнаў.

— Групком № 2 саюзу працасьветы, паведамляе, што 1-га сьнежня, а 7 гадз. у памяш. 8-ай школы (Энгельса № 8) адбудзецца працяг агульнага сходу аб крытыцы і самакрытыцы.

Суд.

Помсти клясавых ворагаў

На лаўцы падсудных кулакі—забойцы грамадзкага працаўніка лясьніка, члена с-с. камсамольца Комара.

Перад судом праходзяць каля 30 сьведак. Паказаньні сьведак разнахарактарны. Адна частка сьцвярджае, што Мітары, Рачыцкі і Гут Сымон, „цішэй вады, ніжэй травы", што яны ня толькі не пагражалі лясьніку, а нават жылі з Давыдам у „добрых адносінах". Другая часта сьведак падкрэсьлівае факт пагроз з боку Рачыцкага і маткі Мітараў 60 гадовай старухі Маліноўскай.

Пасьля складаньня пратаколаў на Рачыцкага і Маліноўскую яны зьявіліся к лясьніку Давыду Комару з пагрозамі.

Рачыцкі ўздымаецца з месца і тлумача —я не страляў у лясьніка—гэта стралялі Вайтовічы, якія цяпер у Салаўках.

Доля праўды высьветлена. Рачыцкі і Мітары сапраўды сувязі з Сідарам Комарам ня мелі, у ночы задушэньня лясьніка былі ў Менску і на млыну „Тартак".

Судовамэдыцынская экспэртыза дала заключэньне, што лясьнік Давід Комар задушан не адным Сідарам Комарам, а групай ня менш 3 чалавек. Лясная драма застаецца скрытай, 2 невядомыя злачынцы ня выяўлены. Пасьля прамовы пракурора, грамадзкага абвінавайца і абаронцаў сэсія прыгаварыла: Сідара Адамава Комара да вышэйшай меры сацыяльнай абароны на растрэл; Марыю Комар па сем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем са спагнаньнем з іх на карысьць маткі забіт га Параскі Комар па 15 р. штомесячна да сьмерці; Франц Рачыцкі асуджан да шасьці месяцаў прымусовых работ з вызваленьнем з-пад варты па заліку папярэдняга зьняволеньня, Мітары Сяргей і Аркадзі і Сымон Гут апраўданы.

Прысуд спатканы са здаваленьнем.

Д. Кастроў.

ШАХМАТЫ № 40

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЭРСКАГА.

ЗАДАЧА № 38 М. Н. ПЕ[illegible] МЕНСК.



Бел. Кр f8, Cb1, Ke4, Kf6 [illegible] Чорн. Кр h6.

МАТ У 3 ХАДЫ

У Віцебску разыгран матч [illegible] дро і Б. Гейманом, матч [illegible] карысьць М. Жудро + 6 —

7-я ПАРТЫЯ ГЭТАГА

Бел. Жудро, чорн. Гейман

1. d2-d4 e7-e6, 2. e2-e4 d7-[illegible] c7-c5!, 4. Фd1-g4 Kb8-c6, 5. [illegible] 6. Cf1-d3 g7-g6, 7. b2-b4 Фd8-[illegible] Kc6-b4, 9. Cc1-d2 Kb4:d3? Kc2 + і на Cc2:Фc2; Kf[illegible] Cd2-c3 Фb6;, і за лепшае фі[illegible] віцьцё чорныя маюць 2 пеш[illegible] Фc7-b6, 11. b2-b3 a7-a5, 12. [illegible] 13. Фg3-f4 h7-h6, 14. Фf4-f5 [illegible] Kf3-g5! h6:g5, 16. h5-h6 Cf8:[illegible] Фb6-c7, 18. Kb1-a3? Лепей [illegible] . . . . Фc7-c5, 19. b3-b4 a5:b[illegible] Фc5-b6!, крыху лепей было [illegible] роўна партыя ўжо чорных [illegible] Cd2:g5 Ke7-f5, 22. Ka3-b5 [illegible] Лc1-c7 чорныя здаліся. На [illegible] вільная, але даволі цікавая [illegible]

Менск. У матчы паміж Ке[illegible] элем, Мазэць выйграў пер[illegible] партыі.

У клюбе „Мэдпрацаўнікоў [illegible] па шахматны турнір чам[illegible] пры ўдзеле 14 ігракоў: на п[illegible] сца Кузьмінскі + 7 з 7! да[illegible] і Камянецкі.

Сёньня а 7 гадзіне ў ве[illegible] шканьні культаддзелу ЦСПС [illegible] насяджэньне шахматна-шаш[illegible] пры культаддзеле ЦСПСБ. [illegible] шахматна-шашачны актыў. [illegible]

БІБЛІАГРАФІЯ.

У гэтых днях у Менск[illegible] дзьве новыя кніжкі выдаве[illegible] Лісток" 1) П. А. Раманоўск[illegible] павінен ведаць а дэбюце". [illegible] дана добра і даволі цікав[illegible] кошт 60 кап., 2) Б. М. [illegible] „Роля эяшпілю ў шахматнай [illegible] кніжцы разглядаюцца абраз[illegible] ных партый і як ігракі пры [illegible] сягаюць выгаднага канца пар[illegible] кошт 30 кап.

Наогул, абедзьве кніжкі за[illegible] увагі.

Адказны рэдактар П. [illegible]

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

З ПРЫЧЫН АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ СПАТКАНЬНЕ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ З МАСТАКАМІ ГОРАДУ МЕНСКУ

НАЗНАЧАНАЕ НА 30 ЛІСТАП[illegible]

ПЕРАНОСІЦЦА НА 1 СЬНЕЖНЯ.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІК[illegible]

1 сьнежня а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Пісьм[illegible] (Савецкая, 68) адбудзецца спатканьне мастакоў г. М[illegible] пісьменьнікамі.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Выступленьне мастацкай арганізацыі „Ромб" з дакладам [illegible] чых шляхох беларускага выяўленчага мастацтва.

2. Выступленьне Галоўмастацтва Наркамасьветы т. Некрашэ[illegible] меньнікаў, культаддзелу ЦСПСБ, саюзу прац. мастацтва і інш. арга[illegible]

З 2-х гадзін дня ў Доме будзе адчынена невялікая [illegible] ка выяўлончага мастацтва (творы членаў арганізацыі [illegible] прысьвечанае спатканьню.

Запрашаюцца пісьменьнікі, мастакі г. Менску, [illegible] навуковыя і грамадзкія працаўнікі і іншыя.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 25 лістапада „ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА" і кіно-хроніка Белдзяржкіно «Новы горад» Гомельшчына. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 25 лістапада. Выключны мастацкі фільм „ЧОРНЫ ПАРУС" драма у 6 частках. Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 65. Пачатак а 7 гадзіне.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 25 лістапада „ВАНЬКА ІМСЬЦІВЕЦ" У 6 ЧАСТКАХ. каса адчынена штодня з 2 гадзін дню.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". З панядзелка 25 лістапада. Бэстэр Кітон у амэрыканскай камэдыі „ГЕНЭРАЛ" у 7 част. Звыш праграмы: кіно-хроніка „Савкіно" № 64.

На падставе прысуду за 27 верасьня 1929 году народ Чэрвенскага раёну, Менакругі і арт. 196 з карн. санкцыяй 1 ч. 213 КК за незапісаньне па кнігах Раваніцкага спажывецкага т-ва памольнага збору, ад чаго ў кнігах бухгальтэрыі ўзьнікла блытаніна, абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне Шашуту Сяргею Аляксееву, 26 год., прыказч. крамы Раваніцкага спаж. т-ва, які шыхарств. у вёсцы Раваніцкая Слабада, Раваніцкага сельсавету, Чэрвенскага раёну.

Крупіцкі с.-савет, Самахвалавіцкага раёну, Менакругі апавяшчае, што гр. Сташэўскі Алесь Юрыаў. жых. х. Старына, Узьланскага с-савету жадае зьмяніць прозьвішча „Станішэўскі" на прозьвішча „Ламака".

Асоб, якія маюць пратэсты зупроць [illegible] прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым Крупіцкі с-савет.

Мазырскі акруговы суд на падставе прысуду ад 14 лістапада 1929 г. абвесьціў грамадзк. ганьбу згодна 213 арт. КК памошніку майстэра фанэры фабрыкі „Чырвоны Кастрычнік" Міндліну Абраму за грубыя адносіны да работніцы Цымерман.

Народ Чэрвеньскага раёну, Мазырскай акругі на падставе прысуду за 6 верасьня 1929 году і арт. 196 з карнай санкцыяй 1 ч. 213 арт. КК за нясумленныя адносіны да сваіх абавязкаў, якія выразіліся ў тым, што дзякуючы яго адсутнічаньню з каапэрацыйнай крамы, якою ён загадваў, быў утворан крадзёж тавараў, абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне Лугоўскаму Зьмітру Ільлюкову, 21 г., селяніну-серадняку, ня судзімаму, беспарт., сябру ЛКСМ, пісьмен. жыхару вёскі Асаўскі Бор, Даманавіцкага сельсавету, Чэрвенскага раёну, Менакругі.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—90 кап. 3 мес. 2 р. 70 кап. 6 мес.—4 руб. год — 8 руб.

Чытайце і выпісвайце „САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ" БЕЛАРУСКУЮ ШТОДЗЁННУЮ ГАЗЭТУ ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ

АДКРЫТ ПРЫЕМ ПАДПІСКІ на 1930 г.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

ПАВІННА БЫЦЬ у руках кожнага актывіста, члена савету, настаўніка, агранома, урача і наогул савецкага служачага.

Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі, лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі контрагэнцтва друку і канторай газэты (Менск, 2-гі Дом Саветаў)

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

Беларускаму Цэнтральнаму Саюзу малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі патрэбны наступныя спэцыялісты:

1) Інжынэр-эканаміст па будаўніцтву.
2) Тэхнік-будаўнік.
3) Эканаміст-плянавік (жадана агранам).
4) Агранам па кармавых расьлінах.
5) Інструктар-рэвізор (бухгальтар).

—(АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.)—

Заявы і даныя аб ранейшай працы накіроўваць: Менск, Савецкая, 46.

МОМЕНТАЛЬНЫЙ АВТОМАТИЧЕСКИЙ СЧЕТЧИК (усовершенствованный). Цена 50 к. Дает немедленно, без всяких знаний и наставлений, готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов с быстротой чтения глаза. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложени. платеж от 4 р. Заказы и деньги направляйте по адресу: Москва 14, Главный почтамт, почтовый ящик № 1084-118 А. И. ЦУКЕРШТЭЙНУ.

Народны суд Клімавіцкага раёну, Магілеўскай акр. выкінае ў суд гр-на вёскі Каспэрні, Галіцкага с-савету Грыневіча Васіля Янкава, ці просіць паведаміць сваё апошняе месцажыхарства.

Усім асобам, якія ведаюць аб месцажыхарстве гр-на Грыневіча, ці аб яго сьмерці, таксама просьба паведаміць суду.

Народны суд Круглянскага р-ну Аршанскай акр. на падставе прысуду ад 28 ліпеня 1929 г. 237 арт. Кр. Код. за абразу гр-на в. Старае Палаўсе Вярхоўскага Алеся абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне настаўніку Старапалескай школы Гірутуну Паўлу Апанасаву.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вайскова-вучотная кніжка № 959 Асіпова І. М., выд. Гарэцкім Ваенкаматам, кв. № 165п.

— Сяброўскі білет № 21560 Кажанова В. М., выд. саюзам працоўн. зямлі і лесу, кв. № 165п.

— Комсамольскі білет № 94173 Леўшунава С. М., выд. Аршанск. праф. тэх. школай, кв. 165п.

— Пасьведчаньне асобы за № 94 Душкевіча І. П., выд. белар. с-гасп. акадэм, кв. 165п.

— Дапрызыўная кніжка Кіселева В. Г., выд. Горацкім Ваенкаматам, кв. 165п.

— Стралкавая кніжка Кіселева В. Г., выд. 3-й пулем. ротай у 1928 годзе, кв. 165 п.

— Дапрызыўная кніжка Лазерка М., выд. Халопеніцкім вайсковым сталом, кв. № 160п.

— Вайсковая кніжка Казлоўскага П.А., выд. Барысаўскім Ваенкаматам, кв. 161п.

— Дапрызыўная кніжка Швайбовіча М., выд. Халопеніцкім вайсковым сталом, кв. 162п.

— Вучотна-вайсковы білет № 66 Буглака П. Н., выд. Калінкавіцк. вайсковым сталом, кв. 164п.

— Атэстат аб скончэньні рабфака пры горацкай акадэм, за № 120 на імя Клецкіна В. С., кв. 165п.

— Вучотна-конская карт. № 125 Кошкіна Т. А., выд. Горацкім РВК, кв. 165п.

— Студэнцк. пасьведчаньне № 125 Танчэўскага А. Е., выд. праўл. горацкай с-гасп. акадэм., кв. 165п.

— Часовае вайсковае пасьведчаньне за № 125 Танчэўскага А. Е., выд. праўл. с-гасп. акадэм, кв. 165п.

— Сяброўская кніжка Касі[illegible] выд. у 1925 г. саюзам праца[illegible] 165п.

— Вучотна-вайсковая кніж[illegible] ва Е, М., выд. Горацкім Ва[illegible] 165п.

— Вучотна-конская карт, з [illegible] Школьнікава А. М., выд. Го[illegible] кв. 165п.

— Сяброўскі білет Лагун[illegible] выд. саюзам прац. зямлі і ле[illegible]

— Дапрызыўная кніжка [illegible] М. А., выд. Пачэнскім Ва[illegible] 165п.

— Пасьведчаньне аб скан[illegible] рацкага с-гасп. інстытуту в [illegible] на імя Пэўзнера З. Б., кв. 16[illegible]

— Вучотна-конская карт. [illegible] га М., выд. горацкім РВК, [illegible]

— Сяброўскі білет № 477[illegible] К. І. прац. зямлі і лесу, вы[illegible] мам. б. акадэм. кв. 165 п.

— Чырвонаарм. кніжка Бе[illegible] выд. камандзірам 9-й роты [illegible] палка, кв. 165п.

— Вучотна-конская карт. [illegible] Калтупава П. выд. Горацкім[illegible] там, кв. 165 п

— Вучотна-вайсковая кніж[illegible] віча М. Д., нарадж. 1907 г. в [illegible] ВК, кв. 152п.

— Вучотна-вайсковая кніж[illegible] С. В., выд. Рэчыцк. ВК, кв. [illegible]

— Пасьведчаньне за № 48 [illegible] шлюбу, выд. Рэчыцк. ЗАГС[illegible] нічны лісток, выд. Рэчыцкай [illegible] на імя Крылова М. І., кв. 15[illegible]

— Мэтрычн. выпіс за № [illegible] скага Л. Ф., выд. Рэчыцкім [illegible] кв. 152п.

— Вучотная карт. Дворкін[illegible] радж. 1907 г. выд. 1-